КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 43 (266) ◂ 18 лістапада ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**АЛЕСЬ МАРАЧКІН**

Стар. 14

**БЕЛАРУСКІЯ ЗАКЛАДНІКІ**

Сёлета з’явіліся першыя спробы пошуку крэдытаў пад заклад актываў буйных прадпрыемстваў. Падобная практыка мела месца ў Расіі ў 1990-я гады

Стар. 5

**ЯК НАЗАРБАЕВА ПАСАДЗІЛІ**

Культ асобы Назарбаева выйшаў на новы якасны ўзровень. У Алма-Аце адкрытая манументальная скульптурная кампазіцыя «Казахстан».

Стар. 13

**ЗАБОЙСТВА ВІЛЬГЕЛЬМА КУБЭ**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ПАРТРЭТ У ПАМАРАНЧАВЫХ КОЛЕРАХ**

Нарыс Таццяны Уласенка

**З НАГОДЫ**

# ПАПУЛІЗМ ПА-РАНЕЙШАМУ Ў ТРЭНДЗЕ

Вольга ХВОІН

**У вышэйшым кіраўніцтве дзяржавы назіраецца хістанне. Кіраўнік ураду публічна выказвае нязгоду з ранейшай эканамічнай палітыкай, кіраўнік дзяржавы ставіць на месца прэм’ера, але і сам пачынае «мяняць паказанні», спрабуючы лавіраваць у новых сацыяльна-эканамічных умовах.**




Нонсенс для Беларусі: прэм’ер-міністр Міхаіл Мясніковіч публічна крытыкуе Адміністрацыю прэзідэнта і спрабуе даказаць, што ранейшая лінія паводзінаў у прыняцці эканамічных рашэнняў неэфектыўная. Паводле разлікаў урада, калі працягнецца пустая эмісія ў 2012 годзе, то беларускі рубель будзе абясцэнены яшчэ ў 2,5 разы. На думку ўрада, цвёрдая грашова-крэдытная, бюджэтна-падатковая палітыка дасць магчымасць стабілізаваць сітуацыю і знізіць інфляцыю ў наступным годзе да 19%. Калі ж працягваць эмісійнае фінансаванні эканомікі і ў ранейшым аб’ёме крэдытаваць дзяржпраграмы, то гэта выкліча рэзкі рост інфляцыі, лічаць ва ўрадзе.

«На 2011 год у планах у якасці крыніц фінансавання будаўніцтва 7,5 мільёна квадратных метраў жылля, малочна-таварных фермаў, свінагадоўчых комплексаў і цэлага шэрагу іншых праграм закладзена было… нуль рублёў. Нуль!» — раскрываў таямніцы беларускага эканамічнага цуда Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Савета міністраў. «Вы так актыўна дапамагалі фарміраваць усе праграмы, — звярнуўся прэм’ер да памочніка прэзідэнта Сяргея Ткачова, — на працягу апошніх 10–15 гадоў». «Вы павінны выдатна разумець, што ў нас сышліся чатыры праблемы, — працягваў Міхаіл Мясніковіч. — Гэта дэфіцыт бюджэту, дэфіцыт аплатнага балансу, нерэальны абменны курс і адсутнасць рэальных крыніц фінансавання жылля і іншых дзяржпраграм».

Каб пазбегнуць далейшага пагаршэння сітуацыі ў эканоміцы, урад прапануе скараціць тэмпы росту ВУП, фінансаванне дзяржпраграм, аб’ёмы эмісіі. Урад просіць і работнікаў Адміністрацыі прэзідэнта падтрымаць гэты сцэнар развіцця эканомікі. «Мы просім падтрымаць той прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця, які падрыхтаваны», — звярнуўся Мясніковіч да памочніка прэзідэнта. Урад прапануе Адміністрацыі прэзідэнта зацвердзіць на будучы год той 1,5% тэмп росту ВУП. Штучнае павелічэнне росту ВУП да 7,1% будзе мець вельмі негатыўныя наступствы.

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка хутка адрэагаваў на спробы Савета міністраў расхістаць лодку стабільнасці ў вышэйшым кіраўніцтве. «Вы занадта захапіліся непапулярнымі метадамі, Міхаіл Уладзіміравіч. Вы, той, хто нарадзіўся ў вёсцы і вырас на кубку малака, як я і многія, што тут сядзяць, — заявіў Лукашэнка, звяртаючыся да прэм’ер-міністра Міхаіла Мясніковіча. — Рынкавая пазіцыя ўрада сёння прывяла да таго, што ў нас ужо бензін утрая даражэй: вось, курс долара — і ўсё, наперад! Ніхто не падумаў аб тым, як жа гэта зрабіць лепш, як мы рабілі 15 гадоў запар. І што за практыка ківаць на стары ўрад? Не трэба гэта рабіць, гэта непрыгожа, ужо людзі смяюцца».

Падобны дэмарш урада нельга назваць бязглуздай выхадкай. Наадварот — гэта паказчык таго, што вярхі не хочуць і, галоўнае, не могуць працаваць у ранейшым рэчышчы. Але перахоп ініцыятывы ў будаўніцтве стабільнай дзяржавы з рук адзінага правадыра найперш небяспечны для яго самога. Бо можа атрымацца так, што гарантам чаркі і шкваркі ў вачах народа паўстане іншая асоба. Сітуацыя не настолькі простая, каб мяняць коней на пераправе, але абсалютна нельга адмаўляць таго, што гэты публічны жэст непаслухмянства ў хуткім часе адаб’ецца на ўрадзе. Імкненне пазбегнуць зараджэння (і тым больш нараджэння) пятай калоны ў сценах дзяржаўных кабінетаў — цяпер вялікі клопат. Таму ёсць Следчы камітэт, Аператыўна-аналітычны цэнтр, Савет бяспекі, што падпарадкоўваюцца непасрэдна Лукашэнку.

У жаданні паказаць, хто ў дзяржаве гаспадар, Аляксандр Лукашэнка часам нават пачынае супярэчыць сваім словам. Распачынаюцца праграмы прыватызацыі — і вось у час рабочай паездкі па Мінскай вобласці Лукашэнка заяўляе: «Ніякай прыватызацыі!»

«Бяздумнай прыватызацыі ў нас не было і не будзе. Расіяне, украінцы нам зайздросцяць. Дык навошта нам ісці па іх шляху лібералізацыі? Трэба развівацца самім, спакойна. Навошта сёння прадаваць тое, што мы давялі да розуму? Навошта прадаваць тое, што сёння рэнтабельна працуе і прыносіць прыбытак? Ніякай прыватызацыі. Ні ў якім выпадку», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Натуральна, пасля такіх слоў усе праграмы, пілотныя праекты, што пачалі рэалізоўвацца ў гэтым кірунку, не будуць адпраўленыя на сметніцу. Але для аматараў атрымаць кавалкі дзяржуласнасці і адпаведны кавалак самастойнасці ўладай зроблены канкрэтны пасыл.

У маштабных спаборніцтвах палітычнага лідара Беларусі ёсць месца і для больш дробных сацыяльных пытанняў. Праўда, у цяперашніх умовах яны могуць у любы момант вырасці да пагрозлівых памераў. Таму папуліцкая лінія застаецца ў трэндзе.

▶ ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ПОЛЬШЧА НЕ ЗМЯНІЛА СТРАТЭГІЮ

Вольга ХВОІН



**Палітыка Польшчы ў адносінах да Беларусі кардынальна не змянілася пасля падзей 19 снежня 2010 года, запэўнівае пасол Польшчы ў Беларусі Лешак Шарэпка.**

«Наша стратэгія застаецца той жа, — мы хацелі б, каб Беларусь блізка супрацоўнічала з Еўропай і намі. У нас ёсць многа пляцовак для супрацоўніцтва, вялікі гандлёвы абмен. Мы ў першай пяцёрцы вашых эканамічных партнёраў, сёлета гандлёвы таваразварот будзе тры мільярды долараў. Але ёсць ясныя ўмовы для супрацоўніцтва, — выказаўся спадар Шарэпка наконт беларуска-польскіх адносінаў падчас сустрэчы з журналістамі ў Мінску. — Пяць-шэсць кандыдатаў у прэзідэнты апынуліся ў турме пасля выбараў. Калі яны бандыты, чаму яны ўдзельнічалі ў выбарах, а калі не бандыты, чаму яны сядзяць у турме?»

Лешак Шарэпка заявіў, што «дэмакратычны свет» чакае пераўтварэнняў ад Беларусі. «Развівацца трэба згодна з традыцыям ААН, выконваць агульныя правы. Беларусь — сузаснавальнік ААН, але чаму ж яна не выконвае тое, што запісана ў статуце ААН?» — сказаў пасол. Ён падкрэсліў, што крытыка ў адносінах да ўладаў Беларусі — нармальная з'ява: «Гэта не змова супраць Беларусі. Дэмакратычны свет адкрыта кажа, што думае аб сітуацыі ў Беларусі. Трэба прыслухоўвацца. Але рашэнне за вамі, вы павінны гэта зрабіць. Мы гэтага чакаем».

Адказваючы на пытанне аб польскіх грошах беларускай апазіцыі, дыпламат падкрэсліў, што МЗС Польшчы і пасольства «апазіцыі ніколі не дапамагае, гэта не ў нашай кампетэнцыі, падобнай дапамогай звычайна займаюцца фонды». «Усе праекты — на нашым сайце. Мы, у рамках малых грантаў, дапамагаем розным недзяржаўным арганізацыям. На пачатку гэтага года мы завяршылі праект абсталявання сучасным медабсталяваннем дзіцячай бальніцы ў Гомелі. Мы выдаткавалі на гэта 40 тысяч еўра», — расказаў аб фінансавай дапамозе пасол.

Аднак спадар Шарэпка панаракаў, што пасольства мае «велізэзныя праблемы, каб рэалізаваць праекты, бо нашы заканадаўствы супярэчаць адно аднаму». «Ваша заканадаўства наўмысна спрабуе выкінуць нас у «шэрую зону», а мы б хацелі дапамагаць недзяржаўным арганізацыям», — дадаў ён. Дыпламат у якасці прыкладу прывёў Украіну, дзе ў час сваёй працы ён займаўся менавіта падобнымі праграмамі, і дзяржава ніяк не перашкаджала супрацоўнічаць з НДА.

Пасол Польшчы ў Беларусі таксама нагадаў, што яшчэ ў лютым мінулага года было падпісана міжурадавае пагадненне аб бязвізавым малым памежным руху. У верасні 2010 года польскі бок перадаў увесь пакет дакументаў у Беларусь, але далейшага руху па гэтаму пытанню няма. «Нам сказалі, што ваш прэзідэнт быццам бы падпісаў гэтае пагадненне ў снежні мінулага года. Але быццам бы з'явіліся нейкія тэхнічныя праблемы, таму праца прыпынілася. Мы шматразова звярталіся да беларускіх уладаў, каб паскорыць гэты працэс, бо гэта найперш выгодна беларусам: у бязвізавай тэрыторыі апынуцца два буйныя гарады — Брэст і Гродна. Наш прэзідэнт нядаўна нават прыязджаў на мяжу ў Кузніцу і таксама гаварыў аб гэтым пагадненні», — распавёў аб цяжкасцях двухбаковага паразумення дыпламат.

▶ УЗНАГАРОДА

# ЧАРГОВАЯ ПРЭМІЯ ПРАВААБАРОНЦАМ

Генадзь КЕСНЕР

**Намеснік старшыні зачыненага ўладамі Праваабарончага цэнтра «Вясна» 14 лістапада ў Капенгагене (Данія) атрымаў міжнародную прэмію Politiken Freedom Prize, якой уганараваны «Вясна» і асабіста кіраўнік арганізацыі Алесь Бяляцкі «за выбітны ўнёсак у барацьбу за правы чалавека і дэмакратыю ў Беларусі».**



Валянцін Стэфановіч

Прэмія заснавана і ўручаецца дацкай газетай «Politiken Daily», што актыўна займаецца тэмай праваў чалавека.

Як распавёў «Новаму часу» Валянцін Стэфановіч, гэтая прэмія ўручаецца штогод асобным людзям і арганізацыям, якія праявілі сябе ў барацьбе за правы чалавека і дэмакратыю. Па словах юрыста і праваабаронца, уручэнне прэміі адбылося ў офісе газеты «Politiken Daily», куды прыйшло шмат людзей, якія цікавяцца праблемамі Беларусі.

«Пасля цырымоніі ўганаравання я дзесьці дзве гадзіны адказваў на пытанні розных людзей, у тым ліку і журналістаў, пра сітуацыю ў нашай краіне, пра справу Бяляцкага і гэтак далей, — распавёў Валянцін Стэфановіч. — Гэтая прэмія выглядае як металічная статуэтка, на якой выгравіравана: «Алесь Бяляцкі» і «Вясна», ёсць таксама і грашовы складнік гэтай прэміі ў памеры 100 тысяч дацкіх крон, якія я, канешне, з сабой не прывёз. Але мы плануем адкрыць банкаўскі рахунак тут, у Беларусі, перавесці грошы на гэты рахунак, а потым, як нам тут нядаўна сказалі, трэба будзе пайсці ў Дэпартамент па гуманітарнай дапамозе і напісаць зварот. Рада нашай арганізацыі прыняла рашэнне скіраваць гэтыя грошы на дапамогу палітычным вязням і сем'ям палітрэпрэсаваных, вось мы і ўкажам мэту расходавання гэтых грошай і гэтай бязвыплатнай замежнай дапамогі як «падтрымка палітычных зняволеных». Наколькі я разумею, па працэдурах гэта «іншыя мэты», як тое ўказана ў дэкрэце №24, а гэта азначае, што нас накіруюць узгадніць гэтыя мэты ва Упраўленне справамі прэзідэнта, Адміністрацыю прэзідэнта. Гэтыя мэты можа ўзгадніць і непасрэдна сам прэзідэнт. Вось і паглядзім, як кіраўнік дзяржавы ўзгодніць нам расходаванне грошай у якасці дапамогі ахвярам палітычных рэпрэсій».

Па словах Валянціна Стэфановіча, у выпадку, калі гэтыя грошы не будуць зарэгістраваны ў Беларусі і не будзе дазволу іх тут расходаваць, то, паводле працэдур, устаноўленых дэкрэтам №24, будзе аформлена банкаўскае вяртанне і грошы будуць адпраўлены назад тым, хто іх выдаткаваў праваабаронцам. «Такім чынам, мы правядзём своеасаблівы «следчы эксперымент», — адзначыў Валянцін Стэфановіч.

▶ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# СТОП 193.1!

**14 лістапада грамадскія ініцыятывы «Права на веру» і «СТОП 193.1!» прадставілі на прэсавай канферэнцыі заключэнне Еўрапейскай камісіі за дэмакратыю праз права (Венецыянскай камісіі) адносна артыкулу 193.1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.**




У заключэнні, прынятым Камісіяй 18 кастрычніка 2011 года, гаворыцца, што артыкул 193.1 парушае Міжнародны пакт аб палітычных і грамадзянскіх правах і з'яўляецца патэнцыйным інструментам для дзяржавы ў стрымліванні грамадскіх актывістаў, дае ўладам шырокія паўнамоцтвы ўмешвацца ў фундаментальнае права на свабоду асацыяцыяў, свабоду думкі, перакананняў і іх выказвання.

«На жаль, гэты артыкул не губляе сваёй актуальнасці, — зазначыў каардынатар ініцыятывы «Права на веру» Аляксей Шэін. — Пасля выбараў 2006 года паводле гэтага артыкулу было асуджана 18 чалавек. Зараз у яго поле дзейнасці трапляе новая катэгорыя — хрысціяне. За апошні час Пракуратура Рэспублікі Беларусь вынесла 8 папярэджанняў незарэгістраваным пратэстанцкім цэрквам. Паколькі ў Беларусі вельмі вялікая колькасць грамадскіх і рэлігійных арганізацыяў, якія не маюць рэгістрацыі, пад пагрозай тысячы чалавек».

Прадстаўнік Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў і каардынатар кампаніі «Стоп 193.1!» Сяргей Лісічонак паведаміў, што тэкст заключэння на англійскай мове з перакладам на рускую мову будзе разасланы ў тыя органы дзяржаўнай улады, якія прымаюць рашэнні або могуць уплываць на тых, хто можа прыняць рашэнне аб адмене гэтага ганебнага крымінальнага артыкула. Гэта Палата прадстаўнікоў і Савет рэспублікі, Адміністрацыя прэзідэнта, Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце, КДБ ды іншыя ўстановы, каб кожны з іх меў магчымасць прачытаць меркаванне міжнародных незалежных экспертаў.

«Ад сёння мы запачаткоўваем шэраг мерапрыемстваў, якія будуць вынікам супольнай працы грамадскіх арганізацыяў і прадстаўнікоў рэлігійных супольнасцяў, і будуць скіраваны на мінімізацыю наступстваў артыкулу 193.1 у беларускім грамадстве», — падкрэсліў Сяргей Лісічонак.

**Паводле інфармацыі Асамблеі НДА**

▶ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ВЫКЛЮЧАЮЦЬ ЗА АНТЫКАМУНІЗМ

**Маладафронтаўца Паўла Сяргея хацелі выключыць з політэхнічнага каледжу. Фармальна — за парушэнне статутных правілаў.**

«Ты не герой, а турэмшчык», — паведамілі ў адміністрацыі каледжу хлопцу. Нагадаем, 7 лістапада Павел Сяргей з паплечнікамі закідаў яйкамі сімвал камуністычнай эпохі — помнік Леніну, за што трапіў на суткі.

Павел Сяргей навучаецца ў Маладзечанскім дзяржаўным політэхнічным каледжы. Ягоныя антыкамуністычныя ідэі, як высветлілася, выклікаюць раздражненне ў кіраўніцтва каледжу.

16 лістапада зранку Паўла выклікалі да дырэктара Бардзеева, які паведаміў, што сёння на адмысловай нарадзе было вырашана яго адлічыць.

«Пішы заяву, ці мы будзем самі цябе адлічваць», — сказалі хлопцу. Ад напісання заявы юнак адмовіўся, чым выклікаў хвалю абурэння ў дырэктара.

«Далі абхадны ліст, каб я пацвердзіў, што не маю запазычанасцяў перад бібліятэкай, выкладчыкамі і г. д. Сказалі, што заўтра будзе гатовы загад аб адлічэнні», — апавядае Павал Сяргей.

Але ўжо 17 лістапада майстар паведаміў Паўлу, што адміністрацыя каледжу змяніла сваё рашэнне. Як лічыць хлопец, пасля шырокай агалоскі ў СМІ.

**Паводле інфармацыі МФ**

▶ ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# У ПАДАРУНАК ШКОЛАМ

**Пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь перадае ў падарунак дзевяці школам у Беларусі спартыўны інвентар.**

У залежнасці ад патрэбаў, школы атрымаюць канькі, спартыўную форму, мячы, сеткі, сталы для настольнага тэніса і іншы спартыўны інвентар, набыты ў мясцовым гандлі. Пры гэтым размова ідзе аб СШ №7 у Брэсце, СШ №15 і №28 у Гродне, школах №24, №56, №73 і №206 у Мінску, гімназіі №2 у Пінску і гімназіі №2 у Слуцку.

Гэтыя школы прымаюць удзел у ініцыятыве «Школы — партнёры будучага», што падтрымліваецца Федэральным урадам Германіі і ахоплівае 1 500 школ ва ўсім свеце, у якіх у якасці замежнай мовы паглыблена вывучаецца нямецкая.

Падтрымка спорту садзейнічае ўмацаванню сувязей з грамадзянамі краіны знаходжання і з'яўляецца адным з аспектаў знешняй культурнай палітыкі Федэральнага ўрада Германіі.

Першая перадача спартыўнага інвентару адбылася ў сераду, 16 лістапада, у мінскай школе №73 на вуліцы Калініна, 17.

**Паводле інфармацыі пасольства ФРГ**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЗАВІСЛІ?

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Здаецца, беларуская судовая сістэма дае збоі. Калі раней усе казалі, што беларускі суд падначалены беларускай уладзе, то зараз у гэтым узнікаюць вялікія сумневы. Прынамсі, гэта вынікае з апошніх рашэнняў беларускіх судоў.**

Беларускі ваенны суд 15 лістапада абвясціў рашэнне па «справе Грамовіча». Амаль усім фігурантам вынесены апраўдальныя прысуды.

Слуханне справы пачалося 21 мая 2010 года, пасяджэнні праводзіліся ў закрытым фармаце. Да крымінальнай адказнасці былі прыцягнуты 36 чалавек, большасць з якіх з'яўляліся службовымі асобамі мытні «Заходні Буг» (у тым ліку два намеснікі начальніка мытні і начальнік паста) і ўпраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці (былыя намеснік начальніка ўпраўлення, а таксама начальнік аддзела па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй). Паводле ацэнак следства, ад нявыплаты мытных плацяжоў дзяржаве быў нанесены ўрон у памеры больш як 30 мільярдаў рублёў.

У СМІ гэту справу назвалі «справай Грамовіча» па прозвішчы арыштаванага 15 студзеня 2009 года былога дырэктара дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю Анатоля Грамовіча.

У выніку БВС прыняў рашэнне спыніць вытворчасць па крымінальнай справе ў дачыненні да дзевяці фігурантаў з-за адсутнасці ў іх дзеяннях складу злачынства. Гэтыя людзі маюць права на поўную рэабілітацыю, аж да аднаўлення на ранейшым працоўным месцы.

Яшчэ 25 абвінавачаных прызнаны невінаватымі за недаказанасцю ў частцы ўчыненых злачынстваў. У іх ліку Анатоль Грамовіч і былы намеснік начальніка мытні «Заходні Буг» Яўген Селіванаў.

У дачыненні да яшчэ чатырох абвінавачаных крымінальныя справы, па рашэнні БВС, павінны быць накіраваны ў Генеральную пракуратуру для новага папярэдняга расследавання. Асобна ад астатніх выносіўся прысуд па двух епізодах «справы Грамовіча»... красавіка 2011 года. Кавалёў абвінавачваецца ў саўдзеле ў тэракце.

Варта зазначыць, што ў сваім выступленні Абразей больш казаў пра Канавалава, чым пра Кавалёва. Даказваючы невінаватасць галоўнага абвінавачванага, ён аўтаматычна спрабаваў даказаць невінаватасць свайго падабароннага. Многія аргументы ў выступленні Абразея былі ідэнтычныя або перасякаліся з аргументамі абаронцы Канавалава Дзмітрыя Лепрэтэра.

У Камітэце дзяржаўнай бяспекі Беларусі мяркуюць, што зачытанае дзяржабвінаваўцам абвінавачванне Дзмітрыю Канавалаву і Уладзіславу Кавалёву «развеяла домыслы» ў справе аб тэракце ў мінскім метро.

«Як паказаў судовы разбор, намаганнямі праваахоўных органаў было прадухілена магчымае ўчыненне больш сур'ёзных выбухаў, абвінавачанне ж, агучанае дзяржабвінаваўцам, развеяла домыслы, якімі апаненты дзейнай улады спрабавалі пасеяць сумненні ў грамадстве», — гаворыцца ў паведамленні Цэнтра інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ.

**Федэрацыя прафсаюзаў прапаноўвае ўраду ўстанавіць падаходны падатак 20% для «багатых» — грамадзян, чый штомесячны даход перавышае 1 тысячу долараў**

Суд улічыў, што па шэрагу інкрымінаваных артыкулаў мінулі тэрміны даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці, і на гэтай падставе крымінальныя справы спынены. У той жа час, як стала вядома з аб'яўленай часткі прысуду, многія абвінавачваныя падчас папярэдняга следства добраахвотна выдавалі незаконна нажытую валюту. Усе гэтыя грошы — больш за 150 тысяч долараў — рашэннем суда вернуты ў даход дзяржавы.

Таксама і ў судзе над «тэрарыстамі» не ўсё добра. Падчас судовых спрэчак 15 лістапада ў Вярхоўным судзе Станіслаў Абразей, адвакат Уладзіслава Кавалёва, папрасіў суд апраўдаць яго падабароннага па эпізодзе выбуху ў сталічным метро 11

Пра якія «домыслы» і «сумненні» ідзе гаворка, не ўдакладняецца.

Праваабаронца Алесь Бяляцкі па ранейшаму абвінавачваецца па частцы 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса (утойванне даходаў у асабліва буйным памеры), аднак фармулёўка абвінавачання зменена.

Удакладненае абвінавачванне зачытаў судзе пракурор Уладзімір Сайкоўскі. Паводле яго слоў, праваабаронца атрымліваў частку даходаў з грошай, што паступалі на яго замежныя банкаўскія рахункі, у сувязі з выкананнем ім дагаворных абавязацельстваў. Раней абвінавачанне лічыла ўсе сродкі, якія знаходзяцца на рахунках Бяляцкага ў літоўскім і польскім банках, яго даходам.

На думку абвінавачання, Бяляцкі наўмысна не падаў падатковым уладам звесткі аб даходах за 2007 год і не адлюстроўваў у дэкларацыі даходы, што паступалі на яго замежныя рахункі, чым нанёс дзяржаве ўрон у асабліва буйным памеры.

Што гэта значыць? Тры самыя гучныя справы развальваюцца? Хутчэй за ўсё, так.

А тым часам Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі прапаноўвае ўраду ў наступным годзе ўстанавіць падаходны падатак 20% для «багатых» — грамадзян, чый штомесячны даход перавышае 1 тысячу долараў. Гэтая і некаторыя іншыя прапановы ўтрымліваюцца ў пераліку, які федэрацыя накіравала ў Савет міністраў і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, паведамляе прэс-служба ФПБ.

Гэту меру прапаноўваецца «ўстанавіць на 2012 год як выключэнне», а дадатковы прыток сродкаў за кошт павелічэння стаўкі падатку накіраваць на аказанне падтрымкі малазабяспечаным грамадзянам.

Акрамя таго, прафсаюзная арганізацыя прапаноўвае прыпыніць павышэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі і праезд у гарадскім грамадскім транспарце з чацвёртага квартала гэтага года да першага квартала наступнага года; да Новага года аказаць малазабяспечаным грамадзянам разавую матэрыяльную дапамогу; павялічыць дапамогу па доглядзе за дзіцем да трох гадоў; перагледзець умовы вяртання валютных крэдытаў, атрыманых грамадзянамі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у беларускіх рублях па курсе ніжэйшым за ўстаноўлены на валютнай біржы на 30%.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### УЛАДЗІМІР САМСОНАЎ



Выбітны беларускі тэнісіст Уладзімір Самсонаў Алімпіяду 2012 года разглядае як апошні шанец для сябе скарыць гэтую найвышэйшую спартыўную вяршыню.

«Я гляджу на свой узрост, а Алімпіяда не праводзіцца кожны год, — адзначыў Самсонаў у інтэрв'ю БелаПАН. — Паспрабую зрабіць усё, што магчыма, падрыхтавацца добра. Спадзяюся, што пашанцуе, у тым ліку з жараб'ёўкай і падчас матчаў. Практычна ўсе гульні на Алімпіядах я прайграў у вельмі ўпартай барацьбе, шанцаў выйграць было шмат. Нават не ведаеш, чаму гэта адбываецца. Быццам бы ўсё ў тваіх руках, але ты прайграеш».

Па словах Самсонава, у апошні час настольны тэніс даволі моцна змяніўся. «Гульцы сталі фізічна значна мацнейшымі, стала значна больш магутнай гульня. Гэта назіраецца не толькі ў настольным тэнісе, але і ў іншых відах спорту. Аднак майстэрства ўсё ж таксама вельмі важна», — адзначыў спартсмен.

Уладзімір Самсонаў, якому цяпер 35 гадоў, не думае пасля Алімпіяды завяршаць спартовую кар'еру. «Можа, буду менш гуляць. У апошнія гады вельмі моцна стаміўся, і не толькі ад гульні, але і ад падарожжаў. Знаходжуся дома вельмі мала, а час ідзе, дзеці растуць. Я люблю знаходзіцца побач з сям'ёй. У гэтым годзе я прайграў вельмі шмат матчаў супернікам, якія ніжэй за мяне ў класіфікацыі. Напэўна, гэта нейкі знак, але пакуль я досыць высока стаю ў рэйтынгу, і сканчаць кар'еру не мае вялікага сэнсу», — мяркуе тэнісіст.

Уладзімір Самсонаў — экс-першая ракетка свету. Трохразовы пераможца Кубка свету (1999, 2001, 2009). 6-разовы чэмпіён Еўропы ў розных разрадах. 4-разовы пераможца «Еўра-Топ–12» (1998, 1999, 2001, 2007). 5-разовы пераможца еўрапейскай Лігі чэмпіёнаў. Удзельнік чатырох Алімпіяд (1996, 2000, 2004, 2008)

### МІХАІЛ ХВАСТОЎ



Пастаянны прадстаўнік Беларусі пры аддзяленні ААН у Жэневе Міхаіл Хвастоў, адказваючы 14 лістапада на пытанні экспертаў Камітэта ААН супраць катаванняў, запэўніў, што 19 снежня 2010 года міліцыя разганяла дэманстрантаў «ашчадна». Па словах Хвастова, дзеянні дэманстрантаў і штурм Дома ўрада былі расцэненыя ўладамі як спроба дзяржаўнага перавароту. Дыпламат адзначыў, што міліцыя пры разгоне акцыі выкарыстала дубінкі, але «дзейнічала ашчадна, не прымяняючы вадамёты».

Хвастоў заявіў, што ўсім падазраваным і абвінавачваным па справе аб беспарадках 19 снежня «своечасова тлумачыліся іх правы на абарону і падаваўся адвакат». Па скаргах некаторых адвакатаў на немагчымасць убачыць падабаронных Генпракуратура, паведаміў Хвастоў, правяла праверкі і «не выявіла парушэнняў для магчымасцяў кантакту».

Дыпламат таксама паведаміў, што афіцыйны Мінск цяпер вывучае даклад БДІПЧ АБСЕ па выніках маніторынгу судовых працэсаў па справе 19 снежня і, магчыма, скарыстае выкладзеныя ў ім рэкамендацыі. Пры гэтым Хвастоў падкрэсліў, што «інстытуты ЕС аказвалі ціск на суддзяў», калі ўносілі іх у спісы неўязных на тэрыторыю краін Еўрасаюза.

### ВІКТАР ШАЎЦОЎ



У СМІ з'явіліся паведамленні аб арышце аднаго з блізкіх да Аляксандра Лукашэнкі прадпрымальнікаў — банкіра Віктара Шаўцова.

Шаўцоў — адзін з самых непублічных беларускіх алігархаў. Акрамя Трастбанка, яму належаць активы вельмі розных кампаній — ад акцый СП МАЗ-МАН, якое выпрабляе седлавыя цягачы, да музея нацыянальных промыслаў Беларусі «Дудуткі». Ён валодае долямі ў некалькіх сумесных прадпрыемствах, самае вядомае з якіх — ЗАТ «Белзамежбуд». Менавіта дзейнасць «Белзамежбуда» ў Венесуэле, па версіі сайта «Хартыя–97», стала прычынай арышту Шаўцова. Ён займаецца рэалізацыяй найбуйнейшых беларускіх будаўнічых праектаў у Венесуэле, у тым ліку ўзвядзеннем заводаў па зборцы аўтамабіляў «МАЗ» і трактароў «Беларусь», завода будматэрыялаў, жылых раёнаў і аграгарадкоў.

Паводле інфармацыі сайта, венесуэльскія партнёры злавілі беларусаў, калі тыя спрабавалі выкрасці дзве тоны арматуры. Інфармацыя была перададзена мясцовымі чыноўнікамі падчас візіту ў Венесуэлу былога дзяржсакратара Савета бяспекі Беларусі, памочніка Лукашэнкі ў асаблівых даручэннях Віктара Шэймана ў кастрычніку 2011 года.

Шаўцоў лічыцца адным з «кашалькоў» Лукашэнкі разам з Уладзімірам Пефціевым і Юрыем Чыжом.

СПРАВА

# НЕ ВЕРАЦЬ НАВАТ ПАЦЯРПЕЛЫЯ

Вольга ХВОІН

**Намеснік генпракурора Беларусі Аляксей Стук папрасіў прысудзіць Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва да вышэйшай меры — смяротнага пакарання. Яны абвінавачваюцца ў здзяйсненні шэрагу выбухаў, у тым ліку выбуху ў мінскім метро 11 красавіка. Прысуд па справе будзе абвешчаны 30 лістапада.**



Дзяржабвінавачання мяркуе, што вінаватасць абвінавачаных па ўсіх эпізодах пацвярджаецца вывучанымі ў судзе доказамі, акалічнасцяў, што змякчалі б віну Канавалава і Кавалёва, няма. Такі суровы вырак яны заслугоўваюць, бо «выключна небяспечныя для грамадства і дзяржавы».

Канавалаў абвінавачваецца ў здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных чч. 1, 2, 3 арт. 289 Крымінальнага кодэкса (тэрарызм), чч. 2, 3 арт. 295 (незаконны абарот зброі, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў), чч. 2, 3 арт. 339 (злоснае і асабліва злоснае хуліганства), ч. 2 арт. 218 (наўмыснае знішчэнне альбо пашкоджанне маёмасці), ч. 1 арт. 14 і ч. 3 арт. 339 (замах на злоснае хуліганства), ч. 1 арт. 14 і ч. 2 арт. 218 (замах на наўмыснае знішчэнне маёмасці).

Кавалёў абвінавачваецца па ч. 6 арт. 16 і ч. 3 арт. 289 (саўдзел у акце тэрарызму), ч. 3 арт. 295, чч. 2, 3 арт. 339, ч. 2 арт. 218, ч. 2 арт. 405 (укрывальніцтва злачынстваў), чч. 1, 2 арт. 406 (неданясенне аб злачынстве).

Дзмітрый Лепрэтар, адвакат галоўнага абвінавачанага Дзмітрыя Канавалава, выступаючы ў спрэчках, заявіў, што яго падабаронны не датычны да выбуху ў Віцебску 14 і 22 верасня 2005 года, і папрасіў суд апраўдаць Канавалава па гэтых эпізодах. Лепрэтар таксама адзначыў, што ўсе акты тэрарызму здзяйсняюцца на якой-небудзь глебе. На думку абароны, абвінавачванне расказала, як здзяйсняліся злачынствы, у якіх прызнаўся Канавалаў, але не адказала на пытанне, навошта ён гэта зрабіў. Адвакат звярнуў увагу на тое, што падчас папярэдняга следства яго падабаронны гаварыў тэрмінамі з Крымінальнага кодэкса «аб дэстабілізацыі абстаноўкі ў Рэспубліцы Беларусь». «Але выразных матываў так і не прагучала», — зазначыў адвакат. «Аб матывах злачынстваў, у якіх прызнаўся Канавалаў, нічога не вядома. Не выключана, што не стане вядома ніколі», — заявіў адвакат абвінавачанага ў тэрарызме Канавалава.

Адвакат Дзмітрый Лепрэтар папрасіў суд не прымяняць да Канавалава смяротнае пакаранне. «Можа, на прыкладзе гэтага рэзананснага працэсу варта паказаць сусветнай грамадскасці, што Рэспубліка Беларусь робіць канкрэтныя крокі да адмены смяротнага пакарання?» — гэтымі словамі адвакат завяршыў свой выступ у спрэчках.

Дзмітрый Канавалаў ад апошняга слова адмовіўся, сказаўшы суддзі: «Не надо».

Другі абвінавачваемы Уладзіслаў Кавалёў заявіў, што ён не вінаваты ў злачынствах, якія яму інкрымінуюцца. Ён перакананы і ў невінаватасці Канавалава. «Я ўпэўнены, што Канавалаў не датычны да гэтых злачынстваў», — заявіў Уладзіслаў Кавалёў падчас спрэчак. Ён яшчэ раз нагадаў аб нестыкоўках у матэрыялах доказу, аб тым, што паказанні на папярэднім следстве даваў пад ціскам, і таму ён ад іх адмаўляецца. — Гэты ціск заключаўся ў пагрозах з боку органаў крымінальнага пераследу. Мае паказанні па гэтых эпізодах супярэчлівыя, бо ўсё, што я гаварыў, мне стала вядома ад аператыўнікаў ГУБАЗ і супрацоўнікаў следчага камітэта, якія паведамлялі мне, што я мушу гаварыць. Пагрозы мелі форму папярэджанняў быць асуджаным у якасці саўдзельніка, за што я атрымаў бы пакаранне ў выглядзе пажыццёвага зняволення ці смяротнай кары. У мяне не было выбару». «Мне сорамна перад сабой і Дзімам, што я аказаўся слабавольным і даў паказанні супраць яго, — дадаў Кавалёў. — Я таксама хачу звярнуцца да пацярпелых: калі я знаходжуся ў гэтай клетцы, гэта яшчэ не значыць, што я здзяйсняў злачынства».

Станіслаў Абразей, адвакат Уладзіслава Кавалёва, папрасіў суд апраўдаць падабароннага па эпізодзе выбуху ў сталічным метро 11 красавіка 2011 года. Абразей таксама лічыць недаказанай віну падабароннага ў неданясенні аб злачынствах.

Згадваючы выбух у метро, Станіслаў Абразей папрасіў суд прызнаць несапраўднымі відэаматэрыялы з Мінскага метрапалітэна ад 12 і 19 красавіка, не прымаць пад увагу экспертызы ФСБ Расіі па антрапаметрычных дадзеных і мантажу відэаматэрыялаў, бо яны праводзіліся на падставе незаконна канфіскаваных відэазапісаў. Адвакат па кадрах расказаў, якія моманты на відэа, на яго думку, маюць яўныя прыкметы мантажу і рэтушы.

Абразей канстатаваў, што эксперты ФСБ не выявілі партрэтнага падабенства асобы на відэа з метро 11 красавіка 2011 г. з Канавалавым. Ён асабліва звярнуў увагу на разыходжанні ў вопратцы меркаванага падазраванага з відэа і Канавалава. А на фрагментах валасоў, змывах з насавых пазух Канавалава не было выяўлена рэчываў арганічнага паходжання, якія адносяцца да выбуховых. «Гэта таксама сведчыць аб тым, што чалавек на відэа і Канавалаў — розныя асобы», — сказаў Абразей.

Абразей звярнуў увагу, што Канавалаў быў затрыманы 12 красавіка ў 23.00, а першы допыт пачаўся 13 красавіка ў 6.00. «Мяркую, што на яго на працягу сямі гадзін аказваўся псіхалагічны і фізічны ціск», — сказаў адвакат. Ён нагадаў, што 13 красавіка падчас другога допыту Канавалаву было вельмі дрэнна, яго ванітавала. Допыт перарываўся пяць разоў, хоць на першым допыце ў гэты дзень ён адчуваў сябе добра.

Адвакат Абразей сцвярджае, што абвінавачванне пабудавана выключна на паказаннях Канавалава, дадзеных на папярэднім следстве. «Калі б не прызнанне Канавалава, у абвінавачвання наогул нічога б не было», — падкрэслівае абаронца. Адзіная ўліка, па яго словах, гэта адбіткі пальцаў Канавалава на ўпакоўцы выбуховай прылады, знойдзенай 3 ліпеня 2008 года. Разам з тым на пакунку няма адбіткаў пальцаў людзей, што знайшлі яго.

Адвакат Абразей заявіў, што паказанні яго падабароннага Уладзіслава Кавалёва — адзінае, на што разлічвала абвінавачванне. Але ў судзе Кавалёў адмовіўся ад гэтых паказанняў, і «планы абвінавачвання змяніліся». Таму для Кавалёва і запрасілі вышэйшую меру пакарання.

Цікава, што нават пацярпелыя выказвалі ў судзе свой недавер доказам абвінавачвання. Пацярпелы падчас выбуху ў мінскім метро Андрэй Тышкевіч заявіў, што суд выклікаў у яго сур'ёзныя сумневы ў вінаватасці Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва. «Я не хачу быць салдатам у не аб'яўленай нікім вайне. Я быў на свяце 3 ліпеня, я быў у метро 11 красавіка. Трэці раз выпрабоўваць свайго анёла-ахоўніка я не жадаю. Стоадсоткавай упэўненасці, што на лаве падсудных тыя, хто здзейсніў гэтыя жахі, у мяне няма. На першае пасяджэнне я ішоў з цвёрдай упэўненасцю, што на лаве падсудных менавіта тыя, хто гэта зрабіў, зараз гэтай упэўненасці ў мяне няма», — сказаў пацярпелы Тышкевіч.

ВАНДАЛЫ

# У БАБРУЙСКУ АПАГАНІЛІ СІНАГОГУ

Марат ГАРАВЫ

**14 лістапада распачата крымінальная справа па фактах апаганьвання сінагогі ў Бабруйску (Магілёўская вобласць), паведаміла карэспандэнту «НЧ» інспектар па сувязях з грамадскасцю ўпраўлення ўнутраных спраў Бабруйскага гарвыканкама Таццяна Гарбанюк.**

Паводле яе слоў, справа па частцы 1 артыкулу 339 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (хуліганства), якая прадугледжвае пакаранне грамадскімі работамі ці штраф, ці арышт на тэрмін шэсць месяцаў, ці пазбаўленне волі на тэрмін да трох гадоў, была заведзена аддзелам міліцыі №1 гарадскога ўпраўлення ўнутраных спраў па фактам злачынстваў у дачыненні да будынку іудзейскай святыні.

У каментары «НЧ» сакратар сінагогі Мая Савацеева паведаміла, што храм Бабруйскай гарадской іудзейскай суполкі Іудзейскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь знаходзіцца ў цэнтры горада, па вуліцы Сацыялістычнай, 36 і размяшчаецца ў старадаўнім двухпавярховым цагляным будынку, пабудаваным напрыканцы XIX стагоддзя менавіта для яўрэйскай святыні. «Хаця ў горадзе пражывае каля тысячы яўрэяў, рэлігійная суполка невялікая, узнавіла сваю дзейнасць у 2002 годзе і складаецца прыкладна з 50 чалавек пенсійнага ўзросту. Вось чаму ў Бабруйску дзейнічае толькі адна наша сінагога», — сказала Савацеева.

Паводле яе слоў, у ноч з 10 на 11 лістапада невядомыя зламыснікі апаганілі агароджу святыні — аэразольнай фарбай чорнага колеру намалявалі нацысцкую свастыку, а мелам зрабілі надпіс «Смерць жыдам!». «11 лістапада мы выявілі гэтыя вырыкі, сфатаграфавалі іх, вызвалі ўчастковага міліцыянера, які склаў пратакол, а затым звярнуліся з заявай на імя начальніка аддзела міліцыі №1 гарадскога УУС падпалкоўніка Алега Шалюты. Пасля таго, як нашу заяву зарэгістравалі, у сінагогу прыязджалі следчыя», — зазначыла Савацеева.

Паводле яе слоў, у ноч з 13 на 14 лістапада адбылося другое злачынства — невядомыя пабілі чатыры шыбы аднаго з пластыкавых шклопакетаў, што былі нядаўна ўсталяваныя ў аконныя праёмы храма. Ахоўнік сінагогі, які знаходзіўся ў будынку, але не меў магчымасці адразу выклікаць міліцыю, засведчыў, што гэты напад, у якім удзельнічала вялікая група моладзі, адбыўся ў дзве гадзіны ночы.

Як адзначыла Савацеева, 14 лістапада па гэтаму факту злачынства была таксама пададзена заява ў міліцыю. «Напад на будынак вернікі назвалі хуліганскай і варварскай выхадкай. А нанесеныя на агароджу святыні малюнак свастыкі і тэкст нацысцкага характару абражаюць



чалавечую годнасць. Вельмі сорамна за паводзіны тых, хто зрабіў гэтыя злачынствы, хаця гараджане даволі цёпла ставяцца да нашай рэлігійнай суполкі. Разам з тым, ад нападу на святыню вернікі панеслі вялікія матэрыяльныя страты, якія ім давядзецца пакрываць уласным коштам», — падкрэсліла сакратар сінагогі.

Трэба адзначыць, што ў Бабруйску і раней мелі месца факты апаганьвання яўрэйскіх святынь, у тым ліку і старадаўніх могілак. Так, паводле слоў старшыні мясцовай яўрэйскай суполкі Леаніда Рубінштэйна, толькі на працягу 2007 года былі зафіксаваныя чатыры выпадкі вандалізму на старадаўных яўрэйскіх могілках па вуліцы Мінскай, прычым у ноч з 10 на 11 кастрычніка 2007 года невядомыя злачынцы разбілі на гэтых могілках 15 надмагілляў. «Такія ж факты вандалізму былі і на абодвух праваслаўных могілках горада. Аднак ніколі злачынцы не былі пакараныя належным чынам, хаця былі выяўлены не аднойчы», — падкрэсліў старшыня суполкі.

ГАСПАДАРЧАСЦЬ

# БЕЛАРУСКІЯ ЗАКЛАДНІКІ

Вольга ХВОІН

**Цягам 2011–2013 гадоў, паводле плана, зацверджанага Саветам міністраў, мусяць быць прыватызаваныя 244 аб'екты гаспадаркі. У асноўным гэта прадпрыемствы транспарту, лёгкай прамысловасці, будаўнічай сферы. Сёлета ж з'явіліся першыя спробы пошуку крэдытаў пад заклад актываў буйных прадпрыемстваў. Падобная практыка мела месца ў Расіі ў 1990-я гады, калі грошы браліся пад заклад кампаній, што ў выніку і засталіся ў прыватных руках па сходных коштах.**

У 1990-я гады ў Расіі, якая мела вострую патрэбу ў папаўнення дзяржаўнай казны, былі праведзеныя залогавыя аўкцыёны. На продаж выставілі шэраг найбуйнейшых кампаній. Аўкцыёны называліся залогавымі, бо, у адрозненне ад звычайных аўкцыёнаў, кампаніі не прадаваліся, а аддаваліся ў заклад. Аднак, выкупіць назад дзяржава іх не змагла. У выніку «Нарыльскі нікель», «Лукой», «Сібнафта», Нафтавая фінансавая кампанія, «Сургутнафтагаз» ды шэраг іншых прывабных кавалкаў дзяржаўнай эканомікі, па ацэнцы экспертаў, за нізкую цану перайшлі ў прыватныя рукі. Конкурс на гэтых аўкцыёнах быў вельмі нізкі, а прадпрыемствы выстаўляліся па заніжаных коштах.

Аднак з гэтым нязгодны Павел Данейка — рэктар «Moscow Business School», былы сакратар камісіі па эканамічных рэформах у Вярхоўным Савеце Беларусі: «Я не бачу ў тых продажах нешта прыніжальнае для краіны, тады было столькі грошай і за столькі набывалі. Грошы не маюць абсалютнай вартасці, сума магла б быць большай, але пакупка ацэньваецца паводле генеруемага даходу. І здзелкі на залогавых аўкцыёнах у суадносінах да таго прыбытку былі нармальнымі. Увогуле, я ў гэтых здзелках не бачу нічога ненармальнага: краіна атрымлівае валюту, а прадпрыемства — нармальных гаспадароў».

Беларускія ўлады цяпер спрабуюць рабіць крокі ў аналагічным кірунку — шукаць крэдыты пад залог актываў прадпрыемстваў. Было абвешчана аб гатоўнасці прадаць ААТ Банк ВТБ дзяржаўную долю ў беларускім Банку ВТБ (Беларусь) пры выкананні шэрагу спадарожных умоў. Гэтае пытанне ўжо абмяркоўвалася падчас сустрэчы кіраўніка Банка ВТБ Андрэй Косціна з Аляксандрам Лукашэнкам. «Падчас сустрэчы дэлегацыі абмеркавалі магчымасць павелічэння долі ВТБ у Банку ВТБ (Беларусь) да 100% за кошт набыцця пакета акцый дзяржавы», — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы расійскага банка. ААТ Банк ВТБ (Расія) цяпер валодае 71,4% пакетам акцый беларускага банка.

Адной з умоў продажу капіталу з'яўляецца крэдытаванне прадпрыемстваў нафтахімічнага комплексу РБ і фінансаванне сумесных беларуска-расійскіх інвестыцыйных праектаў. Але галоўная ўмова — выдзяленне Беларусі крэдыту на суму ў 1 мільярд долараў, паведаміла блізкая да банкаўскіх колаў РБ крыніца.

Другі свежы прыклад абмену актываў на грошы — прапанова Мінска да Ашчадбанка Расіі ўзяць кантрольны пакет нафтаперапрацоўчага прадпрыемства «Нафтан» у якасці закладу па крэдыце ў 1 мільярд долараў. Першапачаткова размова ішла аб актывах «Беларуськалію», але, па словах віцэ-прэм'ера Беларусі Сяргея Румаса, аддаваць у заклад акцыі аднаго з найбольш паспяховых беларускіх прадпрыемстваў улады не захацелі. Эксперт Павел Данейка ў сваіх ацэнках гэтых навацый у беларускай эканоміцы стрыманы. «Я пазітыўна ўспрымаю гэтыя крокі. Мяркуеце, што лепш было б, каб гэта засталося ў дзяржуласнасці і прадпрыемствы б загнуліся? — гаворыць Данейка. — Ці пашырыцца гэтая практыка, пакуль сказаць цяжка, але мяркую, што ў выпадку выстаўлення на падобныя здзелкі прадпрыемстваў нафтахімічнага комплексу без удзелу расійскага ці казахскага капіталаў не абыдзецца».

Раней анансавалася здзелка з Ашчадным банкам РФ на 2 мільярда долараў, але іншыя ўдзельнікі гэтага крэдыту (Deutsche Bank) адмовіліся ад папярэдняй дамовы.

Вывесці агульную лінію ў гэтых пробных і пакуль не завершаных здзелках даволі складана, бо няма выніку, абкатаных тэндэнцый. Эканаміст Леанід Злотнікаў гаворыць, што яму як аналітыку пакуль што банальна нестае інфармацыі для абагульнення. Але, паводле яго слоў, «практыка расійскіх залогавых аўкцыёнаў так напалохала свет, што чакаць падобнай маштабнасці цяпер у іншых краінах не варта».

Разам з тым Леанід Злотнікаў не адмаўляе варыянту, што па буйных прадпрыемствах могуць быць прынятыя рашэнні ў рэчышчы палітычных патрэбаў. «У нас рашэнні прымае адзін чалавек, і буйныя прадпрыемствы могуць быць прапанаваны ў залог з нейкіх асабістых меркаванняў. Думаю, цяпер еўрапейскі капітал не пойдзе ў нашу краіну — не тыя ўмовы; хутчэй, тут можна чакаць кітайскія і расійскія грошы. Канешне ж, ёсць верагоднасць, што людзі каля ўлады пад рознымі шыльдамі будуць імкнуцца завалодаць прывабнымі активамі, але — падкрэсліваю — пакуль усе развагі ёсць толькі гіпотэзамі», — гаворыць эканаміст.

Што тычыцца згаданых вышэй планаў па прыватызацыі, то сродкі ад продажу дзяржаўнай уласнасці мяркуецца зрабіць асноўнай крыніцай папаўнення золатавалютных рэзерваў Беларусі ў наступным годзе. Аб гэтым гаворыцца ў праекце «Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2012 год». Агульны аб'ём атрыманых ад прыватызацыі сродкаў плануецца на ўзроўні 2,5 мільярда долараў. Сума не надта вялікая, але ў зацверджаным і даступным для азнаямлення плане прыватызацыі прадпрыемствы дробныя і сярэднія.

Асноўныя прыбыткі ад продажу ў прыватную ўласнасць могуць прынесці аб'екты, якія належаць да «фамільнага срэбра» Беларусі — нафтахімічны комплекс, «Беларуськалій», магістральныя нафтаправоды, аб'екты энергасістэмы. Але продаж, акцыянаванне, заклад гэтых прадпрыемстваў будзе адбывацца па іншых схемах, са старанным адборам патэнцыйных уладальнікаў, што могуць прапанаваць дзяржаве выгодныя кантракты, гарантыі і г. д.




КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# КЛЮШКУ НЕ АДДАСЦЬ



**Як паведамляюць сродкі масавай інфармацыі, беларускія лядовыя палацы пачалі банкруціцца адзін за адным. У нашых эканамічных умовах гэта азначае — стаць у чаргу за бюджэтнымі сродкамі.**

Грошай на аплату электраэнергіі не хапае нават «Мінск-Арэне», што тут ужо казаць пра іншыя палацы, пабудаваныя ў абласных цэнтрах, буйных і не вельмі гарадах. Тут хакей, нават пры наяўнасці прафесійнага клуба, застаецца аматарскім, калі разумець прафесіяналізм як здольнасць клуба зарабляць на гульнёвым працэсе.

У былым СССР акрамя бюджэтнага фінансавання (а што такое бюджэт, як не грошы, сабраныя з усіх, якімі распараджаюцца ўлады?) існавалі так званыя фонды грамадскага спажывання. Прынамсі, з набыткаў прадпрыемства частка адлічвалася на ўтрыманне дзіцячых садкоў, гурткоў самадзейнасці ды інш., што існавалі пры палацах культуры, якія ўтрымліваліся на сродкі прадпрыемства. Таму савецкі чалавек ніколі не атрымліваў столькі, колькі зарабляў. Больш зарабляў, больш плаціў падаткаў, з яго больш адлічвалі ў фонды грамадскага спажывання. А праз гэтыя фонды больш атрымоўвалі тыя, хто лічыў такі парадак разумным і натуральным — партыйныя, прафсаюзныя ды камсамольскія функцыянеры, розныя карысныя для ўлады грамадскія дзеячы і арганізацыі.

У фонды грамадскага спажывання адлічэнні рабілі ўсе, а прэферэнцыі атрымлівалі толькі тыя, каму іх лічылі патрэбным даваць. Некалі вельмі знакамітаму генеральнаму дырэктару вельмі знакамітага беларускага завода прапанавалі давесці заводскую каманду да ўзроўню вышэйшай лігі чэмпіянату СССР. Адказ быў нязменны — не хачу пладзіць дармаедаў.

Дармаеды ці не — пытанне густу. Калі планавая сацыялістычная эканоміка, заснаваная цалкам на «ручным кіраванні» (ад гэтага вазьму, таму дам, таму нічога не дам) запланавана абрушылася, прадпрыемствы ў мэтах уласнага выжывання пачалі пазбаўляцца ад уласных «грамадскіх фондаў». І не толькі ад іх. Там, дзе прадпрыемствы былі «горадаўтваральнымі», яны ўтрымлівалі не толькі аб'екты ўласнага «сацкультбыта», але ўсю гарадскую інфраструктуру. Цяпло гарадскія спажыўцы атрымлівалі ад заводскай ТЭЦ, электрычнасць — ад заводскай падстанцыі, прамысловая каналізацыя была агульнай з гарадской, грамадскі транспарт падтрымліваў сваё існаванне толькі таму, што людзі ездзілі на працу на роднае прадпрыемства.

Нарэшце, утрыманне спартовых, культурных ды дзіцячых устаноў зрабілася занадта цяжкім для прадпрыемстваў у новых умовах. Амаль для ўсіх сталася непасільным утрыманне вытворчых магутнасцяў. Ад іх пазбаўляліся. Амаль усе вытворчыя памяшканні МПАВТ вылічальнай тэхнікі былі здадзены ў арэнду камерцыйным структурам, гадзіннікавы завод «Прамень» здаў у арэнду ўсё, што было можна. А колькі будынкаў, тэхналагічнага абсталявання, аб'ектаў інфраструктуры пайшло на зруйнаванне, так і не знайшоўшы свайго «эфектыўнага гаспадара».

З пачаткам пераходу да рынкавай эканомікі, які прыспешвалі ўсе — прадпрыемствы, урад, спецыяльна створаныя для гэтага інстытуты (прыватызацыі, кіравання дзяржмаёмасцю, антыманапольныя і іншыя) — прадпрыемствы пачалі пазбаўляцца ад сваіх невытворчых актываў, спрабуючы іх ці прадаць, ці здаць у арэнду, ці перадаць на балансы мясцовых тэрытарыяльных органаў. Паціху справа ішла. Для паскарэння не хапала грошай. У каго яны былі, той не хацеў рабіць сумнеўных інвестыцый, а ў жадаючых звычайна грошай не было. У паветры гусцеў дух нажывы, а шляхоў да яго матэрыялізацыі ніхто не ведаў. Дакладней, адны ведалі ды не мелі, іншыя не ведалі, але мелі грошы.

Але, як часта здараецца ў гісторыі, невырашальнае рашэнне прыняў той чалавек, у якога не было ні ведаў, ні грошай. Адна толькі рашучасць усё вырашыць. Прадпрыемствы ён вырашыў «запусціць» насуперак усялякай логіцы (сацыялістычнай і рынкавай) коштам знешніх (палітычна абумоўленых пазык) і мэтанакіраванага пераразмеркавання сродкаў. Бралі нашмат ахвотней, чым давалі, але былі і такія, хто даваў і ахвотна, і болей за іншых. Мусіць, за адзін толькі дым з фабрычных комінаў, які сведчыў аб перспектыўнасці беларускай мадэлі ў сэнсе яднання славянскіх эканомік, яму далі болей грошай, чым беларускі ВУП за некалькі гадоў. Калі ўлічыць, што беларускі чысты экспарт кожны год адмоўны — нашмат болей.

Спартовыя пляцоўкі, лыжаролерныя трасы, стадыёны. А паколькі «Сам» любіў хакей, прыярытэты былі яму і дадзены. Не ў найпростым варыянце, калі домакіраўніцтвы абавязкова ставілі просценькія «каробкі» ды залівалі лёд, а ў выглядзе палацаў. Каб народ карыстаўся і цаніў.

І нельга сказаць услед Мікалаю Озераву, што такі хакей нам не патрэбны. Бо дзіцячыя каманды «бюджэтнага класа» на існаванне маюць усе правы. Тым больш, што плата за карыстанне пляцоўкамі, як кажуць амаль усе, насамрэч невысокая і большасці бацькоў даступная. Адзінае пярэчанне — гэта даступнасць забяспечваецца вельмі вялікімі бюджэтнымі выдаткамі, што ўрэшце робіць фінансаванне лядовых палацаў звычайнай «барскай» прыхамаццю. Вырашыў, што павінна ўсё быць як у Еўропе і «лучше, чем в России» — і баста!

Узяў аднойчы клюшку ў рукі, і нікому не аддасць. Пакуль на каньках стаяць зможа.

ПРАБЛЕМА

# КАМУ СПРАВА ДА МАЛАДЫХ ІНВАЛІДАЎ?

Таццяна ШАПУЦЬКА



**«Гутэн таг», — радасна сустракаюць мяне ў калідоры інтэрната «Адкрытыя дзверы» выхаванцы «Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам». Аказваецца, увечары да іх мусіць прыехаць госць з Германіі, з якім мяне і паблыталі. Даведаўшыся, што я не маю нямецкіх каранёў, выхаванцы тым не менш ветліва запрашаюць на супольную вячэру. Для іх гэта не проста прыём ежы, а паўнавартасны адукацыйны занятак.**

На вячэру — бульбяное пюрэ, запечаная ў жароўні курыца і сок. Элементарны рэцэпт курыцы падказала выкладчыца Ірына Шавель — раскласці на блясе соль, пакласці на яе цэлую курку — і ў жароўню. Смачна, карысна і, галоўнае, проста ў прыгатаванні для навучэнцаў, якія ўсе справы па хатняй гаспадарцы робяць самастойна. Выхавацелькі могуць падказаць на словах, а вось рабіць нешта за выхаванцаў ім не пажадана. «Я не магу падаць бляху — я мушу сказаць, дзе яе знайсці. Я не магу дапамагчы абабраць бульбу — толькі даць параду, як акуратна зняць шалупінне, каб не парэзацца. Такія ўмовы нашага праекта «Крок да самастойнасці». Дзеткі вучацца рабіць хатнія справы, якім іх не навучалі дома: гатаваць, прыбіраць, прасаваць», — распавядае выкладчыца Любоў Каменева.

«Дзеткі» — гэта 29-гадовы Саша, 24-гадовы Лёша, 22-гадовая Даша і 21-гадовая Дзіна. Яны ўчатырох будуць жыць у інтэрнаце (дзве з'яднаныя кватэры ў мікраёне «Паўднёвы Захад» у Мінску) на працягу 3-х месяцаў. Праўда, не ўсім хапае гэтага тэрміну, каб засвоіць асноўныя навыкі самастойнага жыцця — напрыклад, Саша праходзіць курс другі раз.

Час ад часу размова перапыняецца просьбамі хлопцаў пра паўторную порцыю курыцы. Дзяўчаты ахвотна дзеляцца прысмакамі — заслужылі! «Усё па чарзе — учора мы з Дзінай гатавалі, а хлопцы прыбіралі. Сёння вячэру зладзілі хлопцы, затое наша чарга прыбіраць», — распавядае Даша, якая паралельна просіць хлопцаў даць ёй рэцэпт. Юнакі не губляюцца, і просяць узамен рэцэпт учарашняга плову, які гатавалі дзяўчаты. Будзе чым пахваліцца на выходных бацькам!

Правілы ўдзелу ў курсе «Крок да самастойнасці» строгія: меней не менш за 18 гадоў, штодня працаваць у майстэрнях, дабірацца да працы і назад самастойна на грамадскім транспарце. Формы інваліднасці ў навучэнцаў не цяжкія: 2-я і 3-я ступені. Людзі з такімі ступенямі інваліднасці часта жывуць асобна ад апекуноў, працуюць, ствараюць сем'і, нараджаюць і выхоўваюць дзяцей.

Ірына Шавель тлумачыць, што часта здольныя маладыя людзі не могуць рабіць простыя рэчы па хатняй гаспадарцы праз пасіўную пазіцыі бацькоў: «Бывае, што бацькам прасцей самім схадзіць у краму, прыгатаваць ежу ды прыбрацца, чым штодня навучаць гэтаму сваіх хворых дзяцей. Але ж гэта прыводзіць да таго, што дзіця назаўжды застаецца прывязаным да апекуна, не можа абслугоўваць сябе самастойна».

Пасля вячэры дзяўчаты прыбіраюць: Дзіна мые посуд, Даша яго выцірае ручніком. «Дзіна, ты забыла ўключыць гарачую ваду», — робіць заўвагу Любоў Каменева, падсунуўшы руку пад струменьчык вады. На пліце, дзвярах ваннай і прыбіральні вісяць разнастайныя малюнкі-разметкі, каб навучэнцам было прасцей арыентавацца. Напрыклад, некаторыя юнакі не могуць адрозніць канфоркі пліты па традыцыйных азначэннях на ёй, таму кожная канфорка дадаткова пазначаная геаметрычнай фігуркай.

Павячэраўшы, хлопцы ідуць адпачываць у свой пакой, дзяўчаты тэлефануюць дадому і слухаюць музыку. У агульнай гасцінай стаіць велізарны музычны цэнтр, тэлевізар, DVD-плэер. «Учора мы цэлы вечар глядзелі мульцік пра рэйнджараў, рагаталі да ўпаду», — дзеліцца Даша. «Часам тут бываюць цэлыя дыскатэкі! А якія святкаванні мы ладзім на дні народзінаў ці Каляды!» — дадае выкладчыца Любоў, якая ў мінулым годзе на снежаньскія святы была Дзедам Марозам. Дзяўчаты абмяркоўваюць заўтрашнія справы па гаспадарцы, ад якіх ніяк не ўхіліцца — у пакойчыку на дошцы прымацаваны графік абавязкаў для ўсіх навучэнцаў. Расклад будніх дзён прыкладна аднолькавы: пад'ём а 7 раніцы, прыгатаванне сняданка, пасля — на працу (там жа і абед), у інтэрнат вяртаюцца ля 17 гадзіны вечара, потым гатуюць вячэру і прыбіраюць у кватэры. Адна з самых складаных справаў — набыццё прадуктаў.

«Нашы дзеткі амаль не ўмеюць лічыць грошы, іх могуць надурыць у любой краме. Канешне, падчас навучання мы з імі ходзім у краму, а калі яны будуць жыць самастойна? Апошнім разам хадзіла ў краму з Лёшам. Гляджу, а ён выбірае самыя танныя прадукты. Пытаюся, чаго ж так? Можаш браць і даражэйшыя, а ён адказвае, што яго прывучылі купляць самае таннае», — распавядае Любоў Каменева. У чацвер у інтэрнат, як правіла, прыходзяць госці — бацькі, знаёмцы, выпускнікі.

Дарэчы, на сцэнцы ў калідорчыку вісяць фотаздымкі ўсіх «дзетак», якія ўжо прайшлі курс. Пяць дзён на тыдзень выхаванцы праводзяць у інтэрнаце, а на выходныя едуць дадому адпачываць. Дзіна ў суботу і нядзелю ўвесь час праводзіць з сябрамі, у Сашы адпачынак незвычайны — на выходных з каханай дзяўчынай, таксама былой навучэнкай курса (дзе яны і пазнаёміліся), ён шмат катаецца на новых швейцарскіх электрычках «Гарадскія лініі». «Дык дорага ж!» — «А нам праезд бясплатны. Усе кандуктаркі ўжо ведаюць нас». Аднойчы з Сашам здарыўся смешны выпадак — зачыніла дзверы ў прыбіральні ў вагоне. Ягоная сяброўка праявіла надзвычайную кемлівасць — націснула пімпачку SOS і выклікала на дапамогу машыніста.

Усе навучэнцы працуюць у адмысловых майстэрнях. Лёша і Саша вырабляюць драўляныя статуэткі пры царкве Ефрасінні Полацкай (вул. Прытыцкага). Лёша па формах выразае з дрэва анёлкаў, дрэўцы, разнастайных жывёлак — дзіцячыя цацкі, а Саша іх расфарбоўвае. За месяц штодзённай працы хлопцы атрымоўваюць сімвалічную плату — каля 20 тысяч беларускіх рублёў. Саша дадаткова ўладкаваўся дыспетчарам грамадскага транспарту, а вось Лёшу пашчасціла менш — у яго 2-я непрацоўнага група інваліднасці, ён прызнаны недзеяздольным, таму афіцыйна працаваць нідзе не можа.

Дзяўчаты займаюцца ў майстэрні «АртІдэя» (вул. Рабкораўская), якую называюць проста «На Рабкораўскай». Дзіна і Даша пакуль што толькі вучацца плесці аб'ёмныя фігуркі з бісеру, а таму платы не атрымоўваюць, жывуць на пенсію па інваліднасці. Да прыкладу, у Дзіны, якая, як і Лёша, мае 2-ю непрацоўную групу інваліднасці, пенсія складае 500 тысяч беларускіх рублёў. Даша мае 3-ю працоўную групу, але пакуль што афіцыйнай працы знайсці не можа: «Нагаварыла тут адна, што ў мяне ў 2004 годзе была эпілепсія, дык нікуды браць не хочуць, усе ўжо ведаюць», — кола патэнцыйных працадаўцаў у людзей з абмежаванасцямі вузкае, а таму дзяўчына злуецца на знаёмую, якая так яе падставіла.

У Сашы пенсія прыкладна аднолькавая з Дашынай — 550 тысяч беларускіх рублёў, а вось Лёша сваю пенсію называць адмаўляецца: «На ўсё хапае! Усё адно, нікому да нас няма справы», — нечакана злосна выпальвае хлопец. Як мінімум бліжэйшыя тры месяцы справа да яго будзе чацвярым выхавацелькам, якія пазменна штодня працуюць і нават начуюць з «дзеткамі».

Любоў Каменева распавядае, што ўжо ёсць набор і на вясну — магчыма, апошні. Праект прадугледжвае, што ў будучым фундаваць курс «Крок да самастойнасці» мусіць беларуская дзяржава — маўляў, трэба проста паказаць чыноўнікам, як важна прывучаць маладых інвалідаў да самастойнага жыцця, і перадаць справу ў іх рукі. Любоў Каменева сумняваецца, што так станецца: «Мы перыядычна запрашаем прадстаўнікоў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны да нас на заняткі, але пакуль я не бачу перспектывы ў падтрымцы праекту з боку беларускай дзяржавы».

Па маімі развітанні з Дзінай, Дашай, Лёшам, Сашам і іх часовымі «апекунамі» Ірынай Шавель і Любоў Каменевай гучыць званок у дзверы — нарэшце дабраўся госць з Германіі. Гутэн таг!

---

СТАТЫСТЫКА

## 50 ТЫСЯЧ ШТОГОД

**У Беларусі колькасць інвалідаў, якія стаяць на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароны, складае больш за 600 тысяч чалавек — прыкладна 6% да ўсяго насельніцтва краіны.**

Найбольшая колькасць інвалідаў сярод рэгіёнаў краіны налічваецца ў Мінску (каля 150 тысяч чалавек). У агульнай колькасці інвалідаў прыкладна 80 тысяч чалавек маюць першую групу інваліднасці, 330 тысяч — другую, каля 200 тысяч — трэцюю. У краіне налічваецца больш за 30 тысяч інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў.

Ліча ў 5–7% колькасці людзей, што маюць фізічныя адхіленні (інваліднасць), прыкладна аднолькавая для большасць краін. Так, у Расіі налічваецца каля 11 мільёнаў інвалідаў, што складае каля 7% насельніцтва, ва Украіне — 3 мільёна (каля 6%). Сярод краін ЕС найбольшая колькасць інвалідаў у Эстоніі, тут каля 8 працэнтаў насельніцтва атрымлівае сацыяльную дапамогу з прычыны інваліднасці.

Штогод колькасць інвалідаў у Беларусі павялічваецца прыкладна на 50 тысяч чалавек.



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 21 ЛІСТАПАДА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.00** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05** Вострасюжэтны серыял «Знахар».
**11.00** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Расія).
**12.10** Эксцэнтрычная камедыя «Вар'яцкія грошы» (ЗША-Германія).
**13.55** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**16.00** Да цешчы на бліны.
**16.35** Тэлефільм АТН «Лісты з Берastavіцы» цыклу «Зямля беларуская».
**16.50** Вострасюжэтны серыял «Знахар».
**17.50** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Расія).
**18.45, 00.55** «Зона Х».
**19.30** Арэна.
**19.55** Цыкл тэлеперадач «Дыялогі аб цывілізацыі».
**20.25** Канцэртная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.45, 01.05** Дзень спорту.
**22.00** Камандзіроўка.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.15** Клуб рэдактараў.
**00.15** Хакей для ўсіх.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** Контуры.
**10.15** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Фільм «Простая гісторыя».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Вялікая розніца».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.15** Прэм'ера. «Лёс на выбар».
**00.15** «След».
**01.00** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.10** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Вялікі горад».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М. Задорнава.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Гоп-стоп». Расія, 2010 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** Матч па більярдавым спорце.

### 2 Беларусь

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Ясі і худзей.
**09.40** Навіны надвор'я.
**10.10** Жансавет.
**10.45** Кінаспробы.
**11.15** Бітва экстрасэнсаў.
**12.25** Серыял «Катоўскі» (Расія-Украіна).
**13.25** Срыял «Ты маё жыццё».
**14.30** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**15.05** Нянудны глобус.
**15.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**16.10** Прэм'ера. Камедыйны серыял «Зайцаў+1» (Расія). 1-я серыя.
**16.55** Серыял «Катоўскі» (Расія-Украіна).
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Прамая трансляцыя.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** «Беларуская часіна».
**22.35** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.15** Камедыйны серыял «Зайцаў+1» (Расія). 1-я серыя.
**23.55** Авертайм.
**00.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**12.25** «Ранішняя пошта».
**13.00** «Мой срэбны шар».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**23.25** «Дзяжурны па краіне».
**00.20** Навіны - Беларусь.
**00.30** «Выбары 2011. Дэбаты».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Пятніцкі».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** «Школа зласлоўя». Ток-шоў.
**01.10** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**10.30, 18.30, 21.45, 02.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 4х5 км. Эстафета.
**11.15, 17.30, 20.30, 01.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 4х10 км. Эстафета.
**12.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Раўнд 24. Макао (Макао).
**13.00** Матаспартыўны часопіс.
**13.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Пары. Адвольная праграма. Парыж (Францыя).
**14.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Мужчыны. Адвольная праграма (Францыя).
**15.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Адвольная праграма. Парыж (Францыя).
**16.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Адвольны танец. Парыж (Францыя).
**19.30** Футбол. Часопіс.
**22.45** Вось дык так!!!
**23.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**23.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**00.30** Футбол. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.40** Зона «Свабоды».
**08.10** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 2 серыя.
**08.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.10, 14.55, 18.05** Дак. гадзіна: «У яго забралі каханне», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**10.10** ПраСвет.
**10.35** «Ваенныя гульні», дак. фільм, 2009 г., Польшча: 2 серыя.
**11.15** Эксперт.
**11.40, 21.50** «Ітан Фроўм», маст. фільм, 1993 г., ЗША.
**13.25** Зона «Свабоды».
**13.55** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 2 серыя.
**14.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**15.50** ПраСвет.
**16.15** «Ваенныя гульні», дак. фільм, 2009 г., Польшча: 2 серыя.
**17.00** «Таямніца Сагалі», серыял: 6 серыя.
**17.25** Зона «Свабоды».
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Эўропа сёння.
**20.25** Вагон.
**20.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Электравік», дак. фільм, Польшча–Расія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**23.25** Аб'ектыў.
**23.50** Гарачы каментар.

## 22 ЛІСТАПАДА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.40** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка» (Расія).
**10.10** Вострасюжэтны серыял «Знахар»
**11.05** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Расія).
**12.10** Арэна.
**12.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**13.00** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**13.55** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Камандзіроўка.
**15.40** Скрынка перадач.
**16.10** Мастацка-публіцыстычны фільм «Эпоха. Падзеі і людзі».
**16.55** Вострасюжэтны серыял «Знахар».
**17.50** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Расія).
**18.45, 00.55** Зона Х.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** Дзень спорту.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Прамая трансляцыя.
**01.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Каханне праз гады».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**22.20** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.25** Тэорыя неверагоднасці.
**00.10** «След».
**00.55** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Гоп-стоп». Расія, 2010 г.
**10.40** «Справа асаблівай важнасці».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Добры». Германія - Вялікабрытанія, 2008 г.
**15.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Сямейны бізнэс». ЗША, 1989 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Жанчыны ХХ стагоддзя».
**23.30** «Аўтапанарама».
**23.50** «Хірамант 2». Серыял.
**00.45** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял.

### 2 Беларусь

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**10.00** Авертайм.
**10.40** Школа рамонту.
**11.45** Гісторыка-прыгодніцкі серыял «Катоўскі» (Расія-Украіна).
**12.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**13.50** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**14.05** Нянудны глобус.
**14.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**15.15** Камедыйны серыял «Зайцаў+1» (Расія). 2-я серыя.
**15.55** Гісторыка-прыгодніцкі серыял «Катоўскі» (Расія-Украіна).
**16.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**17.50** Тэлебарометр.
**17.55** Хакей. КХЛ.
**19.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Прамая трансляцыя.
**21.55** КЕНО.
**22.00** «Беларуская часіна».
**23.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.40** Камедыйны серыял «Зайцаў+1» (Расія). 2-я серыя.
**00.15** Спорт-кадр.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**23.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя».
**00.20** Навіны - Беларусь.
**00.30** «Выбары 2011. Дэбаты».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**22.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** «Сёння. Вынікі».
**23.25** Футбол Ліга Чэмпіёнаў УЕФА.

### EUROSPORT

**10.30** Футбол. Часопіс.
**11.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 4х10 км. Эстафета.
**12.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 4х5 км. Эстафета.
**13.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Жанчыны. Адвольная праграма. Парыж (Францыя).
**14.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Адвольная праграма. Парыж (Францыя).
**15.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Мужчыны. Адвольная праграма. Парыж (Францыя).
**16.30** Футбол. Часопіс.
**17.30** Live. Футбол. Алімпійская кваліфікацыя. Азія. Бахрэйн - Японія.
**19.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 4х10 км. Эстафета.
**20.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 4х5 км. Эстафета.
**21.00** Футбол. Часопіс.
**23.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA. Германія.
**01.00** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**01.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**01.45** Ралі. Ралійная серыя IRC. Агляд сезону.
**02.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Паказальны выступ. Парыж (Францыя).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Заказное забойства», маст. фільм, 1984 г., Вялікабрытанія.
**09.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**09.20** «Таямніца Сагалі», серыял: 6 серыя.
**09.45** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**10.05** Еўропа сёння.
**10.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Электравік», дак. фільм, Польшча–Расія.
**11.00** МакраФон: «Рок па вакацыях–2008»: ч. 2.
**11.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**12.00** «Ранча», серыял: 6 серыя.
**12.50** «Таямніца Сагалі», серыял: 6 серыя.
**13.15** Еўропа сёння.
**13.45** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Электравік», дак. фільм, 2005 г., Польшча–Расія.
**14.10** МакраФон: «Рок па вакацыях–2008»: ч. 1.
**14.55** «Заказное забойства», маст. фільм, 1984 г., Вялікабрытанія.
**16.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.35** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**17.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 9 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Эксперт.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Арол», серыял: 17 серыя.
**19.00** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**22.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**22.50** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

## 23 ЛІСТАПАДА, СЕРАДА

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.30** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка» (Расія).
**10.15** Вострасюжэтны серыял «Знахар».
**11.05** Дэтэктыў «Апошні кардон-2».
**12.10** Сфера інтэрасаў.
**12.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**13.00** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**13.55** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.40** Усё як мае быць!
**16.10** Мастацка-публіцыстычны фільм «Эпоха. Падзеі і людзі».
**16.55** Вострасюжэтны серыял «Знахар».
**17.50** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Расія). Заключная серыя.
**18.45, 00.45** Зона Х.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**20.00** Панарама.
**20.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Прамая трансляцыя.
**22.55** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**00.00** Канцэртная праграма.
**00.55** Дзень спорту.
**01.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**22.20** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.25** Асяроддзе пасялення.
**00.25** «След».
**01.10** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Сямейны бізнэс». ЗША, 1989 г.
**10.40** «Прагнасць».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант 2». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял.
**16.50** « Прыгоды дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Трусіная нара». ЗША, 2010 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Мінск і мінчане».
**23.30** «Дабро пажаліцца».
**23.50** «Хірамант 2». Серыял. Закл. серыя.
**00.45** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял.

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**09.55** Спорт-кадр.
**10.40** Спартовая меладрама «Грэйсі» (ЗША).
**12.30** Гісторыка-прыгодніцкі серыял «Катоўскі» (Расія-Украіна).
**13.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**14.30** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**15.10** Нянудны глобус.
**15.35** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**16.15** Камедыйны серыял «Зайцаў+1» (Расія). 3-я серыя.
**16.55** Гісторыка-прыгодніцкі серыял «Катоўскі» (Расія-Украіна).
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.50** Тэлебарометр.
**18.55** Жаночая ліга.
**19.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Прамая трансляцыя.
**21.55** «Спортлато 5 з 36».
**22.00** КЕНО.
**22.05** Камедыйны серыял «Зайцаў+1» (Расія). 3-я серыя.
**22.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Мілан -Барселона. Прамая трансляцыя.

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50, 00.20** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**23.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя».
**00.30** «Выбары 2011. Дэбаты».

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Пятніцкі».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Прэм'ера.Серыял «Фармат А4».
**00.35** Серыял «Школа».

**10.30** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**10.45, 02.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**11.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Жанчыны. Адвольная праграма (Францыя).
**12.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Пары. Адвольная праграма. Парыж (Францыя).
**13.15, 17.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны футболу.
**13.25** Фігурнае катанне. Гран-пры. Мужчыны. Адвольная праграма (Францыя).
**14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 4х10 км. Эстафета.
**15.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 4х5 км. Эстафета.
**16.00, 21.00** Футбол. Алімпійская кваліфікацыя. Азія. Бахрэйн - Японія.
**17.10** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131. Хакуба (Японія).
**17.55** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Алма-Ата (Казахстан).
**18.45, 01.55** «Алімпійскія гульні. У Лондан разам». Алімпійскі часопіс.
**19.00** Live. Футбол. Алімпійская кваліфікацыя. Азія. Катар - Паўднёвая Карэя.
**22.30, 01.40** «Спартовае вандраванне. Гольф». Часопіс.
**22.40** Абранае па серадах.
**22.50** Конны спорт. Кубак свету. Канкур. Штутгарт (Германія).
**23.50** Навіны коннага спорту.
**23.55** Гольф. Тур PGA.
**00.55** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**01.00** Ветразевы спорт. Рэгата Rolex Middle Sea. Валета (Мальта).
**01.30** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**01.35** Абранае па серадах.
**02.45** Футбол. Алімпійская кваліфікацыя. Азія. Катар - Паўднёвая Карэя.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25, 19.40** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 17 серыя.
**08.35** Два на два (тэледыскусія).
**09.00** «Тры шалёныя нулі», серыял.
**09.30, 14.15** На колах.
**09.55, 14.40** Рэпартэр.
**10.20, 15.10** Сальда.
**10.40, 15.25** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь: ч. 5.
**10.50, 15.35** Эксперт.
**11.15, 16.00** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**11.30** «Ранча», серыял: 7 серыя.
**12.20** «Арол», серыял: 17 серыя.
**13.20** Два на два (тэледыскусія).
**13.45** «Тры шалёныя нулі», серыял.
**16.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.30** «Euromaxx».
**17.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**17.25** Невядомая Беларусь: «Пастка для апазіцыі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Прыстань», дэтэктыўны серыял.
**18.45** Без рэтушы: «Каліф на гадзіну», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.40** Хто ёсць кім?: «Валянціна і Валянцін Нагорныя».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Беларуская Амерыка», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**21.45** «Каралева Бона», тэлесерыял.
**22.40** Два на два (тэледыскусія).
**23.05** Аб'ектыў.
**23.30** Гарачы каментар (публіцыстычная

## 24 ЛІСТАПАДА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.10** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**10.15** Вострасюжэтны серыял «Знахар».
**11.05** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон-2» (Украіна-Расія). Заключная серыя.
**12.10** Зямельнае пытанне.
**12.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**13.00** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**13.55** «Здароўе». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Адмысловы рэпартаж «Агарафобія».
**15.40** Зона камфорту.
**16.05** Мастацка-публіцыстычны фільм «Эпоха. Падзеі і людзі».
**16.50** Вострасюжэтны серыял «Знахар».
**17.45** Дэтэктыўны серыял «Атрад» (Расія-Украіна). 1-я серыя.
**18.45, 00.30** Зона Х.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45, 00.40** Дзень спорту.
**22.00** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.15** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Шматсерыйны фільм «Фурцава».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Шматсер. фільм «Фурцава».
**22.20** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.25** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.55** «Зваротны адлік».
**00.25** «След».
**01.10** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Фільм «Трусіная нара». ЗША, 2010 г.
**10.40** «Зорныя гісторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант 2». Серыял. Заклю. серыя.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял.
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Загадка Сфінкса». Канада - Вялікабрытанія, 2008 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Праўда».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстры». Серыял.

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Кожны мае права быць розным.
**09.35** Страсці па культуры.
**10.20** Гаспадар.
**10.55** Рэальны свет.
**11.30** Жаночая ліга.
**12.30** Гісторыка-прыгодніцкі серыял «Катоўскі» (Расія-Украіна). Заключная серыя.
**13.30** Серыял «Ты маё жыццё».
**14.30** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**15.10** Нянудны глобус.
**15.35** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**16.10** Камедыйны серыял «Зайцаў+1» (Расія). 4-я серыя.
**16.55** Гісторыка-прыгодніцкі серыял «Катоўскі» (Расія-Украіна). Заключная серыя.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. КХЛ.
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.35** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.15** Камедыйны серыял «Зайцаў+1» (Расія). 4-я серыя.
**23.50** Час футболу.

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Пілот міжнародных авіяліній».
**23.25** Тэлесерыял «Ліквідацыя».
**00.20** Навіны - Беларусь.
**00.30** «Выбары 2011. Дэбаты».

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Пятніцкі».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Прэм'ера.Серыял «Фармат А4».
**00.35** Серыял «Школа».

**10.30, 13.10** «Алімпійскія гульні. У Лондан разам». Алімпійскі часопіс.
**11.00, 19.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 4х10 км. Эстафета.
**12.00, 20.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 4х5 км. Эстафета.
**13.00, 15.50, 18.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны футболу.
**13.30** Футбол. Алімпійская кваліфікацыя. Азія. Бахрэйн - Японія.
**14.45** Футбол. Алімпійская кваліфікацыя. Азія. Катар - Паўднёвая Карэя.
**16.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры.
**17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140.
**18.00** Футбол. Алімпійская кваліфікацыя. Азія. Катар - Паўднёвая Карэя.
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Канада.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**23.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**01.00** Покер. Барселона (Іспанія).
**02.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**02.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Каралева Бона», тэлесерыял: 3 серыя.
**08.30** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**09.10** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 9 серыя.
**09.40** Праект «Будучыня».
**10.10** Навігатар.
**10.25** Хто ёсць кім?: «Валянціна і Валянцін Нагорныя».
**10.40** Два на два (тэледыскусія).
**11.05** Без рэтушы: «Беларуская Амерыка», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**11.25** Без рэтушы: «Каліф на гадзіну», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**11.50** Невядомая Беларусь: «Пастка для апазіцыі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**12.25** «Каралева Бона», тэлесерыял: 3 серыя.
**13.20** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**14.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 9 серыя.
**14.30** Праект «Будучыня».
**15.00** Навігатар.
**15.15** Хто ёсць кім?: «Валянціна і Валянцін Нагорныя».
**15.30** Без рэтушы: «Беларуская Амерыка», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**15.50** Без рэтушы: «Каліф на гадзіну», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**16.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.25** Невядомая Беларусь: «Пастка для апазіцыі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**17.00** «Сонечная дзіда», серыял: 13 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Басанож па свеце.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Па кім маўчыць звон?», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**18.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.40** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 2 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx».
**20.30** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Георгі і матылі», дак. фільм, 2004 г., Балгарыя–Канада–Фінляндыя–Галандыя–Нарвегія–Брытанія.
**22.45** «Новенькая», дэтэктыўны серыял.
**23.30** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар.

ВЫБАРЫ

# ФРАНСУА СУПРАЦЬ НІКАЛЯ

**У Францыі пачынаецца актыўная частка прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, у якой ужо вызначыліся галоўныя праціўнікі. Цяперашняму прэзідэнту Нікаля Сарказі будзе супрацьстаяць кандыдат сацыялістаў Франсуа Аланд. Пра шансы кандыдатаў журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з Аляксандрам Чукаевым, супрацоўнікам парыжскага «Radio Libertaire».**





***— У нас практычна невядома прозвішча Франсуа Аланда, не кажучы пра тое, што ніхто не ведае, што ён за палітык.***

— Франсуа Аланд — вядомы ў Францыі партыйны функцыянер Сацпартыі. Ён нарадзіўся ў сярэдзіне 1950-х і паходзіць з сям'і, якая трымалася левых поглядаў. Пасля вучыўся ў Інстытуце палітычных даследаванняў, які лічыцца кузняй палітычных кадраў. Прыход Мітэрана да ўлады ў 1981 годзе адчыніў гэтай генерацыі сацыялістаў вялікія перспектывы. Аланд пабываў і дэпутатам, і мэрам, і міністрам — і ў выніку стаў першым партыйным сакратаром партыі. Аднак пры гэтым ён заставаўся ў цені больш харызматычных фігур. Толькі пасля таго, як палітыкі т.зв. «gauche caviar» (левыя, якія ядуць ікру, — так называлі сацыялістаў часоў Мітэрана) пачалі сыходзіць на пенсію, для яго адкрыўся сапраўдны шанс.

***— Тым не менш, ён не стаў кандыдатам ад сацыялістаў на выбарах 2007 года, хаця таксама спрабаваў балатавацца ў прэзідэнты...***

— Тады сацыялісты абралі кандыдатам яго грамадзянскую жонку Сегален Руаяль. На гэта паўплываў гучны медыйны скандал. Практычна напярэдадні кампаніі Франсуа кінуў сям'ю (Сегален і Франсуа маюць чацвёра дзяцей) і пайшоў жыць да каханкі — вядомай палітычнай журналісткі. Сімпатыі людзей, натуральна, былі на баку Сегален.

***— Чаму цяпер французскія сацыялісты не жадаюць зноў зрабіць стаўку на Руаяль? Быццам яна някепска выступіла 5 гадоў таму — прайграла Сарказі ўсяго тры працэнты.***

— У мадам Руаяль сапсаваўся імідж. Раней усе бачылі ў ёй такую добрую маці. Аднак апошнім часам яна зрабіла шэраг жорсткіх заяў. Напрыклад, прапанавала адпраўляць непаўнагадовых злачынцаў у спецыяльныя лагеры. Нагадаю, што ў Францыі садзіць у турму можна толькі з 16 гадоў. З-за гэтага квітнее моладзевая злачыннасць. Нягледзячы на праблему з маладымі хуліганамі, грамадства не ўспрыняла прапанову Руаяль. Па-першае, гэта нагадвае практыку, якая існавала ў часы рэжыму Вішы. Па-другое, вельмі падобна на тое, пра што кажа Сарказі, які таксама робіць стаўку на паліцэйскі прэсінг пры вырашэнні шматлікіх сацыяльных пытанняў, і пры гэтым без вынікаў.

***— Гэта тычыцца размоў пра барацьбу з нелегальнай іміграцыяй?***

— Так. Напярэдадні выбараў 2007 года Сарказі абяцаў вырашыць гэтую праблему за кошт дэпартацыі штогод 20 тысяч нелегалаў. Набраць столькі не цяжка. Цяжка прымусіць краіны, адкуль яны паходзяць, прыняць іх назад. Па-другое, асобаў да 18 гадоў можна адпраўляць толькі ў сем'і. Тэхнічна гэта аказалася вельмі складана. Між тым, па французскіх законах, трымаць людзей за кратамі можна толькі месяц. Усіх арыштаваных нелегалаў давялося выпусціць і пачаць працэс іх натуралізацыі.

***— Калі гаворка пра эмігрантаў, хацелася б узгадаць незвычайную ініцыятыву адміністрацыі Сарказі сістэматызаваць каштоўнасці сапраўднага француза. Чым закончыліся дэбаты наконт нацыянальнай ідэнтыфікацыі?***

— Яны працягваюцца, нават існуе спецыяльны дэпартамент, які спрабуе распрацаваць формулу, што значыць быць французам. Аднак канцэптуальна гэтая ініцыятыва закончылася фіяска. Капанне ў гісторыі прыводзіць да парадаксальных вынікаў. Галы — кельты, якіх можна лічыць тубыльцамі, былі знішчаныя менавіта франкамі. Франкі, у сваю чаргу, — гэта германскае племя. Атрымліваецца, што французы — немцы. Такая ідэя супярэчыць асновам калектыўнай свядомасці, якая будуецца на ўспамінах пра Першую сусветную вайну. Варта ўзгадаць, што вайна 1914–1918 шануецца ў Францыі больш за Другую сусветную, лічыцца сапраўднай айчыннай вайной. Тады, прынамсі, не існавала калабарацыі.

***— Ці прынесла Сарказі рэйтынгавыя пункты актыўная знешняя палітыка, напрыклад, вайна ў Лівіі?***

— Хаця было шмат жартаў наконт таго, што яшчэ год таму Сарказі цалаваўся з сябрам Кадафі, лівійская вайна ўзняла папулярнасць Сарказі прыкладна на 3–5 пунктаў. Але цалкам стабілізаваць тэндэнцыю падзення рэйтынгу Сарказі не ўдалося. Справа, думаю, у тым, што пасля прыходу ў Елісейскі палац ён парушыў кодэкс паводзін французскіх прэзідэнтаў. Сарказі — першы ў гісторыі 5-й рэспублікі прэзідэнт, які паводзіць сябе не як прэзідэнт усіх французаў. Ён з самага пачатку пабудаваў сваю кампанію на тэме бяспекі, пагроза для якой, быццам, сыходзіць з бедных прыгарадаў. Дэманізацыя жыхароў тых раёнаў раскалола ўсё грамадства. Ніколі раней не было выпадкаў, калі людзі публічна адмаўляліся паціснуць руку прэзідэнту. Ніколі раней прэзідэнт не баяўся з'яўляцца ў бедных кварталах. Па-другое, Сарказі дэманструе стыль, які для яго статусу вельмі дзіўны. Сарказі захапляецца рознымі цацкамі кшталту залатога гадзінніка Rolex, катаецца на яхтах і г. д. Пры гэтым праз свае кантакты ў папулярных правых выданнях «Figaro» і «Parisienne» ён робіць свой адпачынак і хобі сюжэтамі для навінаў.

***— Дзе крыніца захаплення такімі таннымі прыёмамі?***

— Сарказі ўсё ж цяжка аднесці да сапраўднай французскай эліты. Ён паходзіць з небагатай сям'і, аднак вырас у вельмі багатым раёне. Магчыма адсюль комплекс непаўнавартасці. Акрамя таго, Нікаля Сарказі — вялікі фанат амерыканскага стылю жыцця, які таксама не ўспрымаецца ў Францыі. Дайшло да таго, што падчас цяжарнасці Карлы Бруні прэса ў жарт абмяркоўвала, ці надрукуе «Figaro» ў дзень нараджэння немаўляці яго выяву на ўсю старонку. Бруні давялося публічна заявіць, што яна не жадае падобных публікацый.

***— Калі гаворка пра Карлу Бруні, якая, як вядома, прафесійная спявачка, ёсць нагода паразмаўляць пра адносіны да палітыкі прадстаўнікоў французскай культуры.***

— Стаўленне культурнай эліты да Сарказі вельмі супярэчлівае. Сарказі ад пачатку намагаўся прадставіць сябе як прэзідэнт-рацыяналіст. Так, ён запрасіў у свой кабінет шэраг сацыялістаў, у тым ліку даў пасаду міністра культуры Фрыдэрыку Мітэрану — брату Франсуа Мітэрана. Такая пазіцыя спачатку спадабалася артыстам. Напрыклад, кампанію Сарказі падтрымаў Жэрар Дэпардзье. Аднак зараз большасць інтэлектуалаў на баку сацыялістаў. У тым ліку з-за праблемы настаўнікаў. Сарказі пайшоў на кардынальнае скарачэнне настаўніцкіх кадраў, што выклікала асуджэнне з боку ўсіх. Па-сутнасці, добрая адукацыя — адзіны эфектыўны падыход, каб прыпыніць ператварэнне прыгарадаў у сацыяльныя крымінальныя гета.

***— Хто будзе трэцім на гэтых прэзідэнцкіх выбарах?***

— Безумоўна, Марына Ле Пэн з «Нацыянальнага фронту». Дарэчы, менавіта з-за яе Аланд і стаў адзіным кандыдатам. Пасля аферы Дамініка Строс-Кана лагер сацыялістаў падзяліўся на шматлікія фракцыі. Усе апытанні паказвалі, што ніводны з князькоў гэтых партыйных феодаў не ў стане прайсці ў другі тур, у адрозненні ад Марыны Ле Пэн. Гэта перапужала сацыялістаў, і яны аб'ядналіся вакол фігуры Аланда.

***— Калі Сарказі прайграе, ці зможа «Нацыянальны фронт» стаць галоўнай партыяй правых?***

— Наўрад ці. Сярэдні буржуа ніколі не будзе галасаваць за «Нацыянальны фронт». Гэта партыя багатых гопнікаў, мяснікоў. Але нягледзячы на тое, што Сарказі прыбраў з свайго атачэння больш-менш знакавыя фігуры, наўрад ці яму ўдасца захаваць манаполію на правы цэнтр. Хутчэй за ўсё, адразу пасля яго паразы на правым фланґу ўзнікнуць два–тры полюсы, на базе якіх пачнецца фармавацца нешта новае.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Беларускі ўрад заяўляе пра свае планы па стабілізацыі эканамічнай сітуацыі ў краіне — замарожванне інфляцыі і дасягненне пазітыўнага сальда гандлёвага балансу. Аднак незалежныя эксперты моцна сумняваюцца ў тым, што гэта адбудзецца. Па іх меркаванні, стабілізацыя эканамічнай сітуацыі ў Беларусі залежыць найперш ад таго, ці возьме верх ва ўладзе эканамічны прафесіяналізм над палітычным папулізмам.

**«Deutsche Welle» (Германія)**

Беларускім КДБ затрыманы банкір Віктар Шаўцоў, якога ў рэспубліцы лічаць адным з найболей блізкіх да Аляксандра Лукашэнкі бізнэсмэнаў. Фармальная нагода — крадзеж арматуры на будоўлі ў Венесуэле. Эксперты лічаць, што сапраўдны чыннік у тым, што адзін з фундатараў рэжыму мог занадта шмат ведаць пра «шэрыя» пастаўкі зброі з Беларусі ў Лівію, Сірыю, Іран і Ірак.

**Газета.ру (Расія)**

Чаму ў нас, у Расіі, нягледзячы на прапаганду, так любяць прэзідэнта Лукашэнку? Таму што ён увасабляе сабой постаць згубленага бацькі больш пераканаўча, чым Пуцін і Мядзведзяў з іх голымі торсамі, камбайнамі, журфакаўскімі напаўаголенымі дзяўчынамі. Калектыўны Станіслаўскі не верыць ім, а беларускаму прэзідэнту — верыць. Тата, вярніся!

**«Росбалт» (Расія)**

Рэзкія выказванні Лукашэнкі на адрас NATO злучаны з трагічнай смерцю Муамара Кадафі. Ён лічыць, што гэта натаўскі спецназ знішчыў Кадафі, хоць вядома, што ўдзел прымаў і спецназ такой дружалюбнай беларускаму рэжыму краіны, як Катар. Гэта не сакрэт. Антынатаўскія настроі Лукашэнкі даўно вядомыя. Гэта разлічана на ўнутранае спажыванне. Для ўтрымання ўлады, мяркуюць аналітыкі, Лукашэнка культывуе атмасферу страху і займаецца пошукамі і «прызначэннем» знешніх пагроз.

**«Delfi» (Літва)**

Эканамісты, назіраючы пагібельную эканамічную палітыку, сцвярджаюць, што народ рана ці позна выйдзе на галодныя бунты, і, разумеючы гэта, Лукашэнка ўзмоцнена рыхтуецца, лічаць яны. Лукашэнка апынуўся перад выбарам — выратаванне эканомікі ці ўласнага іміджу палітыка, які ніколі не памыляецца. Як паказала апошняя нарада з урадам (Лукашэнка раскрытыкаваў рынкавыя прапановы эканамістаў), выбар зроблены на карысць амбіцый, а гэта значыць, што новае рэпрэсіўнае заканадаўства будзе мець актыўнае ўжыванне.

**«Независимая газета» (Расія)**

Наступнае пасяджэнне суда па справе Бяляцкага адбудзецца 10 снежня. Эксперты ўпэўнены, што судзіць праваабаронцу будуць не адзін месяц. Мінску выгодна зацягванне справы: праз некаторы час МВФ будзе прымаць рашэнне пра выдачу або нявыдачу яму чарговага стабілізацыйнага крэдыту.

**«Укрпудпром» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УКРАІНА. МАРОЗ АБЯЦАЕ ВЯЛІКУЮ КААЛІЦЫЮ

Аляксандр Мароз, былы спікер Вярхоўнай Рады, абвясціў пра напалеонаўскі план вяртання сацыялістычнай партыі, лідарам якой ён зноў з'яўляецца, у вялікую палітыку. Нагадаем, што пасля таго, як Аляксандр Мароз у 2006-м падпісаў кааліцыю з Партыяй рэгіёнаў, сацыялісты хутка згубілі папулярнасць. Па выніках апошніх парламенцкіх выбараў, СПУ не здолела сабраць патрэбныя 3 працэнты, каб мець сваю фракцыю ў Радзе. Аднак цяпер, на думку Мароза, горшыя часы прайшлі. «Я спадзяюся, што хуткім часам мы ўбачым, што Сацыялістычная партыя — не адна, а што разам з ёй аб'ядноўваюцца прыкладна 9–10 палітычных партый, якія прапануюць грамадству сур'ёзную перспектыву падтрымкі нашай праграмы і нашай ідэі», — сказаў Мароз.

Па словах лідара СПУ, прадугледжваецца, што ў будучае аб'яднанне ўвойдуць сябры трох «Сялянскіх партый», прадстаўнікі партый «Народная ўлада», «Справядлівасць», «Казацкая слава», «Патрыятычная партыя Украіны», «Партыя дзяцей вайны» і іншых палітычных сіл. Лідар СПУ падкрэсліў, што ўжо ўрэгуляваны ўсе працэдурныя і арганізацыйныя моманты. Навіна пра хуткае з'яўленне на палітычным полі новага міжпартыйнага картэлю не выклікала вялікага рэзанансу ў прэсе. Усе згаданыя Марозам структуры — карлікавыя, і іх уплыў на грамадства мікраскапічны. Значна больш журналістаў зацікавіла віншаванне, якое даслаў сацыялістам на іх 20-гадовы юбілей Віктар Януковіч. На думку экспертаў, гэта значыць, што Мароз пацягвае супольна гуляць з Партыяй рэгіёнаў.

**Паводле ўкраінскай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. ЗАБАРАНЯЮЦЬ НАЦЫЯНАЛІСТАМ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ІХ СІМВАЛЫ

Скандальнай называюць польскія правыя партыі рашэнне ветэранаў Арміі Краёвай. Сусветны саюз жаўнераў АК выдаў рэзалюцыю наконт практыкі прывядзення маніфестацый у гонар Дня незалежнасці, які Польшча святкуе 11 лістапада. Маніфестанты падчас маршу выкарыстоўваюць гістарычную сімволіку партый і рухаў, якія змагаліся за незалежнасць Польшчы, у тым ліку сімволіку АК. Гэта і стала прадметам заявы Саюза жаўнераў. Яны пішуць, што змагаліся «за талерантную і свецкую Польшчу», і патрабуюць ад арганізатараў маршу не дэманстраваць сімвалы Арміі Краёвай. З улікам таго, якое месца АК займае ў гісторыі нацыянальнага супраціву, тая заява, безумоўна, моцна б'е па прэстыжу «незалежных». Праўда, не зразумела, якое пакаранне нацыяналісты могуць панесці, калі ўсё ж асмеляцца маршыраваць пад знакамі АК.

**Паводле польскай прэсы**

### ЗША. ГАНДЛЯР ПІЦАМІ СУПРАЦЬ АБАМЫ



Сенсацыйнымі можна лічыць дадзеныя апошніх апытанняў грамадскасці наконт таго, хто можа паспрачацца з Баракам Абамам на прэзідэнцкіх выбарах 2012 года ў лагеры рэспубліканцаў. На першым месцы аказаўся не фаварыт Рык Пэры — губернатар Тэхасу, а чарнаскуры Герман Каін — былы дырэктар сеці піцэрый у паўднёвых штатах. Ён пабіў рэйтынг Пэры і ператварыўся ў аднаго з самых перспектыўных кандыдатаў. Асноўныя прычыны папулярнасці Каіна звязаныя з яго бліскучай біяграфіяй — ён служыў у войску, закончыў універсітэт, прайшоў у бізнэсе шлях ад супрацоўніка да дырэктара. Як вядучы радыё-шоў можа добра размаўляць з людзьмі. Натуральна, сваю ролю адыгрывае колер скуры. Чарнаскуры Каін пазбаўляе дэмакратаў козыра пра тое, што ўсе рэспубліканцы расісты. Нарэшце, Каін адрозніваецца ад хрысціянскіх фундаменталістаў, якія зараз задаюць тон у рэспубліканскай партыі. Каін заклікае амерыканцаў не маліцца, а працаваць, працаваць і працаваць. Пакуль цяжка казаць пра перспектывы Каіна з прычыны адсутнасці ў яго грошай на кампанію і нават нармальнага прафесійнага выбарчага штабу. Аднак усе магчыма. Не дарма блізкая да дэмакратаў прэса ўжо зараз пачала атакаваць Германа, узгадваўшы, што ў 1980-х яго судзілі за сэксуальнае дамаганне да сваіх супрацоўніц.

**Паводле амерыканскай прэсы**

### ГЕРМАНІЯ. ЗА ПРАВА ПІЦЬ ПІВА Ў МЕТРО

Грамадскасць Гамбургу пратэстуе супраць пастановы мясцовага Verkehrsverbund (кіраванне транспартам), адпаведна якой забараняецца піць у гарадскіх аўтобусах, метро алкагольныя напоі. Парушальнікі мусяць заплаціць штраф памерам у 40 еўра. Рашэнне было прынятае месяц таму і, на думку ініцыятараў, цалкам сябе апраўдала. На транспартных лініях стала менш выпадкаў атак п'яных пасажыраў на цвярозых. Публіка, аднак, не думае, што гэта пазітыўная рэформа. Сярод нямецкіх рабочых вельмі папулярна піць у транспарце пасля цяжкага працоўнага дня. З часам моду падхапіла моладзь. Нічога дзіўнага, што ў інтэрнэце ўзнікла грамадзянская ініцыятыва супраць забароны алкаголю на транспарце. У сеці Facebook яе сябрамі з'яўляюцца больш за 5 тысяч чалавек. Між тым, Verkehrsverbund не разумеюць матываў пратэсту. На іх думку, у Гамбургу ўсё яшчэ занадта ліберальна. Напрыклад, у зямлі Ніжні Рэйн — Вестфалія лічыцца парушэннем нават есці нешта ў метро. Гэта цягне за сабою штраф.

**Паводле нямецкай прэсы**

ЛЕГЕНДА

# ЭЛЕМЕНТАРНА, ВАТСАН!

Алег НОВІКАЎ

**Шэрлак Холмс вяртаецца. Упершыню пасля смерці сэра Артура Конан Дойля фонд, што ахоўвае яго спадчыну, дазволіў публікацыю кнігі, якая будзе прызнаная як канон кнігі пра прыгоды вялікага сышчыка з Бейкер-Стрыт 221Б.**



Увогуле, за сваё жыццё Конан Дойль напісаў 56 маленькіх апавяданняў і 4 аповесці, якія распавядаюць пра Шэрлака Холмса і доктара Ватсана. Гэтыя творы аматары творчасці Конан Дойля часта называюць «канон».

Акрамя «канону», ёсць іншыя творы, якія таксама прысвечаныя джэнтльменам з Бейкер-Стрыт, напісаныя, аднак, іншымі аўтарамі. Праз вялікую папулярнасць дэтэктываў Конан Дойля, яшчэ пры яго жыцці ўзнікла шмат «пірацкай» літаратуры пра Шэрлака Холмса. Паколькі пісаліся такія творы па прынцыпу канвеера, на патрэбу простай публікі, ніякай мастацкай каштоўнасці яны не маюць.

Затое пасля смерці Конан Дойля пра прыгоды сышчыка пачалі пісаць больш салідныя і дасведчаныя літаратары. Падобных кніжак, калі верыць рэсурсу Вікіпедыя, толькі на Захадзе напісана каля 150. Фанаты Шэрлака нават вылучаюць у гэтым масіве літаратуры чатыры жанравыя галіны.

Першая — напісанне твораў у стылі Конан Дойля, калі аповед вядзецца ад доктара Ватсана. Храналагічна, звычайна, такія гісторыі адбываюцца на мяжы XIX і XX стагоддзяў у тым жа Лондане. Другая — Холмс і яго сябра пакідаюць поствіктарыянскую Англію. Яны пераносяцца ў часы Другой сусветнай вайны або яшчэ далей у будучыню. Трэцяя — Холмс займаецца барацьбой з інфернальнымі пачварамі, скажам, вампірамі. І, нарэшце, чацвёртая — аўтары адчыняюць нейкія фрагменты экзістэнцыі Холмса. Напрыклад, яго захапленне наркотыкамі або адносіны з жанчынамі.

У некаторых з гэтых кніг папросту фантастычныя сюжэты. Напрыклад, тыбецкі пісьменнік узгадаў, што ў адным з апавяданняў Холмс кажа, што быў у Тыбеце, калі хаваўся ад прафесара Марыярці. Гэтых словаў хапіла, каб напісаць кнігу пра прыгоды сышчыка ў Тыбеце. Прычым аўтар умудрыўся ўпісаць тыя прыгоды ў некаторыя апавяданні Кіплінга.

Іншы пісьменнік з Іспаніі прыдумаў яшчэ больш геніяльны ход. Ён запісаў у атрад вулічных падлеткаў, якія ў апавяданнях Конан Дойля дапамагаюць Холмсу ў яго расследаваннях, маладога Чарлі Чапліна. Кніга называецца, адпаведна, «Элементарна, Чарлі». Нарэшце, нельга не згадаць кнігу пра тое, як Холмс едзе на Бурскую вайну ў Паўднёвую Афрыку. І здагадайцеся, каго ён там сустракае? Маладога Махатму Гандзі, з якім яны не толькі раскрываюць адну таямнічую справу, аднак і фармулююць прынцыпы руху негвалтоўнага супраціву.

Аднак ніводная з усіх гэтых кніг не лічыцца «канонам». Іншымі словамі, не трапляе ў поўны збор твораў, прысвечаных вялікаму дэтэктыву. Крытэрыі тут не вядомыя, аднак, здаецца, вельмі сур'ёзныя. Фонд спадчыны Конан Дойля, які кантралюе склад «канону», бязлітасны да ўсіх. Не ўключыў у «канон» нават апавяданні, якія пісаў Андрыян Конан Дойль, сын стваральніка персанажу. У 1930–1940-я гады Андрыян з дапамогай аднаго прафесійнага літаратара напісаў апавяданняў пра Шэрлака Холмса на цэлы зборнік. У 1954-м кніга пабачыла свет пад назвай «The Exploits of Sherlock Holmes».

Ды што там сын пісьменніка. За бортам аказаліся такія вядомыя літаратары, як Стывен Фрай, або Стывен Кінг. Не дасталася месца ў «каноне» Нейлу Гайману (Neil Gaiman), які са сваім апавяданнем пра Холмса перамог на брытанскім нацыянальным конкурсе малых апавяданняў. Гэта без уліку аўтараў сцэнарыяў, па якіх былі пастаўленыя вельмі някепскія фільмы пра Холмса. Можна згадаць серыю з 14 фільмаў пра прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана, знятых паміж 1939-м і 1946 гадамі з удзелам Бэйзіла Рэтбоўна і Найджэла Бруса.

І вось нарэшце сябры фонду пайшлі на саступкі. 15 студзеня гэтага года дырэкцыя пагадзіліся прызнаць кнігу Энтані Горавіца годнай самога сэра Артура. Кніга, якая называецца «Дом шоўку» (The House of Silk), пачала прадавацца ў Вялікабрытаніі і ЗША з 1 лістапада.

Горавіц — дастаткова вядомы англамоўны літаратар і сцэнарыст. Ён нарадзіўся ў 1956 годзе ў Англіі і перш за ўсё праславіўся як аўтар дзіцячых кніжак. Пасля ён займаўся адаптацыяй навел Агаты Крысці пра сышчыка Эркюля Пуаро для аднайменнага серыялу. Быў аўтарам іншых серыялаў, у тым ліку дэтэктыўных. Напрыклад, «Чыста англійскае забойства» і «Вайна Фойла».

Сюжэт кнігі «Дом шоўку» да самага апошняга дня заставаўся сакрэтам. Вядомыя былі толькі агульныя сюжэтныя хады. Такім чынам, аповесць Горавіца — пераказ запісак Ватсана з дому састарэлых, напісаных праз год пасля смерці Холмса. Ватсан узгадвае адну справу, якая пачалася з абрабавання цягніка ў Бостане, і якая, па словах Шэрлака, настолькі жудасная, што «здольная разарваць тканіну грамадства».

Першыя рэцэнзіі на кніжку Горавіца дастаткова пазітыўныя. Так, «The Guardian» пахваліла твор за тое, што ўсе асноўныя элементы дэтэктыва на месцы, і назвала яго «дыяментавым містычным раманам». Застаецца выказаць надзею, што нягледзячы на цяжкі эканамічны час выдавецтвы Расіі, Украіны і Польшчы (адсюль ідуць да нас ідуць кніжныя навінкі) выкупяць аўтарскія правы на дэтэктыў Горавіца.

Здаецца, што адступаць ім няма куды. Якраз напярэдадні прэзентацыі «Дома шоўку» BBC абвясціў пра выхад у наступным годзе паўнафарматнага серыялу «Шэрлак». Першыя тры пілотныя серыі з'явіліся ў мінулым годзе і атрымалі добрую ацэнку. Так што новы выбух шэрлакаманіі нам забяспечаны. І, адпаведна, інтарэс да твору Горавіца.

Ніколі нельга забыць уражанне ад першай сустрэчы з Холмсам у дзяцінстве. Завязка, інтрыга, напружаны ход следства, выяўленне асобы злачынцы, якога, натуральна, ні ў чым не падазраваў. І, безумоўна, фінал, калі Холмс паслядоўна раскладвае ўсё па паліцах і кажа: «Элементарна, Ватсан». Няўжо Горавіц піша не горш за Конан Дойля?



КУЛЬТ АСОБЫ

# ЯК НАЗАРБАЕВА ПАСАДЗІЛІ

Алег НОВІКАЎ

**Культ асобы Назарбаева выйшаў на новы якасны ўзровень. У Алма-Аце адкрытая манументальная скульптурная кампазіцыя «Казахстан». У яе цэнтры знаходзіцца помнік прэзідэнту Нурсултану Назарбаеву.**



З аднаго боку, такой падзеі трэба было чакаць. Ушанаванне першага прэзідэнта Казахстана даўно стала сапраўднай індустрыяй. У краіне дзейнічае ўніверсітэт, названы ў гонар Абішавіча. Яго прозвішча згадваецца ў назвах шматлікіх паркаў, вуліц і г.д. Выява лідара прысутнічае ў кампазіцыі ў Астане. Нават нацыянальнае свята Дзень сталіцы прывязана да дня нараджэння гаранта — 6 ліпеня.

Асобным накірункам тут з'яўляецца эксплуатацыя вобразу маладога Нурсултана. Нядаўна пабачыў свет мультфільм пра маладога гаранта. Ён таксама стаў персанажам зборнікаў дзіцячых казак.

З другога боку, адкрываць сабе помнік пры жыцці значыла для Назарбаева пайсці супраць ідэалаў юнацтва. Вядома, што да распаду СССР Назарбаеў быў лідарам камсамола і кампартыі, а нормы «будаўнікоў камунізму» пасля смерці Сталіна забаранялі ім узводзіць прыжыццёвыя мемарыялы лідарам. Выключэннем тут быў хіба што Брэжнеў. Пасля таго, як яму ўручылі 4-ю зорку Героя СССР, у Днепрадзяржынску быў адкрыты помнік «дарагому Леаніду Ільічу».

Магчыма, Назарбаеў вырашыў, што па гістарычных мерках ужо роўны Брэжневу. А магчыма, з гадамі забыўся пра статут КПСС. У любым выпадку, пару гадоў таму ён даў згоду на тое, каб яго адлілі ў метале. Помнік Назарбаеву быў прадстаўлены публіцы 11 лістапада. Ён уяўляе сабой фігуру прэзідэнта, які сядзіць на нейкім незразумелым прадмеце, што нагадвае вялікі камень. За ім знаходзіцца выява беркута з распраўленымі крыламі.

На адкрыцці манумента прысутнічала некалькі сотняў чалавек. У асноўнай масе яны апынуліся навучэнцамі ВНУ і каледжаў. Як сказалі самі навучэнцы, іх знялі з вучобы і прывезлі на аўтобусе.

Выступалі службоўцы, дэпутаты, дзеячы культуры. Яны «спаборнічалі» ва ўслаўленні на адрас прэзідэнта.

Мерапрыемства нельга назваць маштабным. Пры жаданні ўлады маглі зрабіць «цукерку» — нагнаць не пару соцень, а дзясяткі тысяч фанатаў. Арганізаваць вялізарны канцэрт з удзелам нейкай поп-зоркі расійскай эстрады.

Сціпласць акцыі тлумачыцца перш за ўсё палітычным кліматам. Пасля нядаўняга прыняцця новага закону аб рэлігіях у краіне актывізавалася радыкальнае ісламскае падполле. Так, у Арытау мелі месца два выбухі. Улады Казахстана абвясцілі, што гэта было справай раней не вядомай тэрарыстычнай групоўкі «Джунд аль-Халіфат» («Салдаты Халіфата»), якая дзейнічае з-за кардону. На наступны дзень у выніку перастрэлкі з ісламістам было забіта 5 паліцэйскіх. Усё гэта адбіваецца на іміджу Назарбаева.

Магчыма, таму нават малы маштаб цырымоніі адкрыцця выклікаў вялікую азлобленасць у грамадстве.

Калі меркаваць па каментарах экспертаў і ўдзельнікаў форумаў, людзі не зразумелі, нашто ў такі час адчыняць помнікі. «Вось так. Там акіматы ўзрываюць, а тут помнікі ставяць. Да якой ступені трэба быць баранам, каб не разумець — не час помнікі ставіць, час парадак наводзіць. Не ўсё добра ў нашай дзяржаве. Баль падчас чумы, спадары з феадальна-карумпаванай кланавай улады, — ён і ёсць баль падчас чумы з чумнымі мазгамі з чумной перспектывай», — піша адзін з каментатараў.

Казахскім патрыётам сорамна за тое, што іх краіна падобная на нейкую сатрапію: «Ганьба. Дакаціліся. Еўропа смяецца з нас. Толькі казахі першыя ва ўсім свеце дадумаліся ставіць помнік прэзідэнту пры яго жыцці. Каму патрэбен помнік пры жыцці чалавека, тым больш палітыка, яшчэ баланс не падвялі яго справам!»

Цікава, што на нацыяналістычных форумах ужо амаль не сустракаецца пастоў, аўтары якіх былі гатовыя выбачыць Назарбаеву яго аўтарытарныя забабоны ў абмен на захаванне незалежнасці. Як кажа казахскі журналіст Андрэй Грышын, гэта наступства ўступлення Казахстана ў Мытны саюз. «Аказалася, што за 20 гадоў Казахстан так нічога і не здолеў. І зараз уступіў у Мытны саюз. Гэта зваротны шлях пад крыло Расіі».

Асобная група каментатараў занялася дэканструкцыяй кампазіцыі аўтараў помніку. Паводле стваральнікаў, кампазіцыя з беркутам і фігурай прэзідэнта сімвалізуе прарыў краіны ў будучыню. Аднак крытыкі пабачылі ў ёй абсалютна іншае. «Бязвольны, стомлены чалавек сядзіць, як фінале фільма «Хросны бацька», — нядобры знак. Магчыма, скульптары тайна мелі намер намякнуць на асабістую катастрофу Назарбаева ў канцы жыцця, як гэта было з Мубаракам ці з Кадафі. Хацелі лізнуць, а эфект атрымліваецца зваротны!»

Шмат хто адзначыў, што беркут з кампазіцыі падобны на сімволіку нацысцкай Германіі.

Не прайшлі міма помніку аматары жартаў. «Нарэшце прэзідэнта Назарбаева пасадзілі», — парадавалі яны сяброў казахскай інтэрнэт-супольнасці. Ёсць і іншыя жарты: «Цікава, а галубоў ад яго адганяць будуць, каб на галаву не с..лі ? «Дзякуй скульптарам — выявілі чалавека пасля запору ці падчас». «Слабо было прэзідэнта ў выглядзе Сфінкса вылепіць? Ды пірамідку, як у фараона, прысабачыць». «Гэта ж рэпетыцыя пахаванняў. А помнік — гэта будучае надмагілле», «Помнік для таго паставілі, каб апазіцыя ўскладала да яго падножжа вянкі».

З'явілася цэлая група каментатараў, якія лічаць, што помнік — не што іншае, як метафарычнае пасланне Назарбаева грамадству: я збіраюся пайсці з улады. Такая думка ўкладваецца ў логіку заявы Назарбаева ад 14 лістапада. У ёй прэзідэнт нечакана заявіў пра пазатэрміновыя парламенцкія выбары. У адпаведнасці з указам, выбары дэпутатаў мажыліса, які абіраецца па партыйных спісах, прызначаныя на 15 студзеня 2012 года. Раней былі чуткі, што пасля выбараў Назарбаеў прызначыць пераемніка і складзе паўнамоцтвы прэзідэнта.

Праўда, магчымы абсалютна процілеглы сцэнар. Практычна ўсе выступоўцы на адкрыцці помніка жадалі прэзідэнту Нурсултану Назарбаеву доўгіх гадоў жыцця. І быццам у якасці адказу да агучанай тэмы ў Астане ў гэты ж самы дзень адкрылася міжнародная навуковая канферэнцыя «Рэгенератыўная медыцына і якаснае даўгалецце».

Яе арганізатар — «Цэнтр навук пра жыццё» пры Назарбаеўскім універсітэце, які б'ецца над задачай сінтэзу эліксіру несмяротнасці. Падчас адкрыцця казахскія навукоўцы паведамілі добрую навіну: «У «Цэнтры навук пра жыццё» Назарбаеўскага ўніверсітэта прыступілі да распрацоўкі непасрэднай праграмы па даўгалецці», — заявіў прафесар медыцыны Дыямент Шарман. Па яго словах, цалкам рэальна працягнуць жыццё старога чалавека як мінімум на 10–20 гадоў.

Так што, магчыма, прэзідэнт нікуды і не збіраецца, а помнік у Алма-Аце — толькі ластаўка манументальнай назарбанізацыі Казахстану.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ЭЛЬМІРА ІСРАФІЛАВА

Журналістка абвешчана татарскімі нацыяналістамі новай Сююмбіке. Сююмбіке — легендарная царыца татарскага ханства. Па легендзе, падчас асады Казані войскамі Івана Жахлівага ў 1522 годзе, яна кінулася з адной з вежаў гораду, каб не трапіць у рукі ворагу. Такую павагу ў асяроддзі нацыяналаў Эльміра заслужыла пасля скандальнай сутычкі з удзельнікамі пікету ў абарону вывучэння рускай мовы ў школах Татарстана ў пачатку чэрвеня гэтага года. Журналістка, якой даручылі зрабіць рэпартаж, забылася пра заданне і ўступіла ў сварку з бацькамі, падчас якой заявіла: «Каму штосьці не падабаецца ў рэспубліцы, могуць з'ехаць». Яна таксама паабяцала «перагрызці любому горла за сваю татарскую мову». Удзельнікі пікету звярнуліся ў паліцыю з заявай пра прыцягненне Ісрафілавай да крымінальнай адказнасці і патрабавалі звольніць яе з пасады журналісткі рэспубліканскага тэлебачання. За журналістку ў сваю чаргу заступілася татарская грамада. У выніку Эльміра перамагла — на днях дырэкцыя яе каналу заявіла, што пакіне Эльміру на працы. Больш таго, яна атрымала запрашэнне ад вядучай татарскай нацыяналістычнай групоўкі Саюз «Азатык» узначаліць татарскі нацыянальны рух. «Я ўзважу ўсе «за» і «супраць» і прыму рашэнне», — паведаміла журналістка, заявіўшы, што ў прынцыпе падтрымлівае дзейнасць саюзу.



### ЮЛІУС МАЛЕМА

30-гадовы нефармальны лідар чорных расістаў Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі (ПАР) выключаны з партыі Нацыянальны афрыканскі кангрэс (ANC) на пяць гадоў. Гэта ўжо другое партыйнае пакаранне для Юліуса, які ўзначальвае моладзевае крыло ANC. Раней яго сяброўства ў ANC прыпынялі на 18 месяцаў за тыя ж самыя грахі — прапаганду нацыяналізацыі шахтаў, экспрапрыяцыі зямель у белых грамадзян, заклікі да гвалту супраць іх, узвялічванне дыктатара Мугабе з суседняй Зімбабве. Гэта ўсё, на думку кіраўніцтва ANC, можа пашкодзіць іміджу партыі. Парадокс, аднак, у тым, ці вернецца Малема ў такую партыю, з якой яго выключылі? А калі вернецца — у якім статусе? Як піша прэса, Юліус можа стаць лідарам новага сацыяльнага руху пратэсту. Эканамічная сітуацыя ў краіне ў апошнія часы пагоршылася. Якраз у дзень выключэння Малемы агенцтва Moody's знізіла інвестыцыйны рэйтынг ПАР да ўзроўню «негатыўны». Маладыя чарнаскурыя — галоўныя ахвяры крызісу — страцілі давер да старой гвардыі ANC, якая кіруе краінай пасля падзення рэжыму апартэіду. Малема выглядае ў іх вачах як герой. У дадатак на яго могуць зрабіць стаўку фракцыі, незадаволеныя Джэйкабам Зумам — кіраўніком партыі і прэзідэнтам краіны. У наступным годзе адбудуцца выбары лідара ANC, і шмат хто не выключае, што Зума з-за тактычных задач не толькі верне Юліуса ў партыю, аднак і прапануе якую-небудзь важную пасаду. Гэта можа значыць радыкальны перагляд адносін паміж белай і чорнай камунамі.



### МЕЛІС МЫРЗАКМАТАЎ

Мэра кіргізскага горада Ош, дзе акрамя кіргізаў жыве шмат узбекаў, абвінавацілі ў намеры стварыць асобную дзяржаву. Падставай для гэтага стала заява Меліса 11 лістапада. У ёй бургамістр Оша паведаміў пра стварэнне асобнай муніцыпальнай міліцыі, якая не будзе падпарадкоўвацца МУС. Сам ініцыятар кажа, што гэта нармальная мера, якая накіраваная на падтрымку бяспекі ў горадзе. Між тым, кіргізскія эксперты лічаць, што Мырзакматаў гуляе ў больш складаную гульню. Як вядома, на днях адбыліся выбары прэзідэнта краіны, якім стаў Алмазбек Атамбаеў. У лютым ён афіцыйна ўступіць на пасаду кіраўніка краіны і пасля можа пачаць тусаваць наменклатуру на месцах, больш прывязваць яе да цэнтру. Меліс Мырзакматаў, быццам, мае намер не падпарадкоўвацца цэнтральным уладам аж да таго, каб ператварыць Ош у асобную дзяржаву. Пры гэтым стаўка будзе рабіцца на кіргізскі нацыяналізм: раней Мырзакматаў прапанаваў перавесці ўсе ўзбекскія школы на кіргізскую мову навучання, што стварыла яму імідж абаронцы правоў кіргізскай нацыі. Таксама на кіргізскіх інтэрнэт-форумах сустракаюцца каментары, аўтары якіх прагназуюць, што Мырзакматаў стварае плацдарм для вяртання ў краіну Курманбека Бакіева, з якім быў у свой час быў на «ты».

▸ ЛЁСЫ

# Алесь Мара: «Я ЗАЎСЁДЫ — ЯК НАПЯТАЯ СТРУНА...»

За сваё творчае жыццё Алесь Мара напісаў звыш 1 тысячы твораў і ўдзельнічаў у больш за 100 персанальных, калектыўных і дабрачынных выставах у Беларусі, Вялікабрытаніі, ЗША, Нямеччыне, Францыі, Польшчы, Расіі і Украіне. Прычым гэтыя выставы праводзіліся ў галерэях, музеях, святынях, палацах і замках, у школах і клубах, каля вясковых платоў падчас плэнэраў, а таксама ў будынках Еўрапарламента ў Страсбургу і Кангрэса ЗША ў Вашынгтоне.

**Творчасць Аляксея Марачкіна (Алеся Мары) вылучаецца ўзнёслацю вобразаў, нечаканасцю кампазіцый, эксперыментамі ў матэрыяле, стрыманасцю і гармоніяй колераў, вытанчаным густам. Адданасць нацыянальным мастацкім традыцыям і цвёрдая грамадзянская пазіцыя прынеслі творцу шырокую вядомасць у Беларусі і за яе межамі. Жывапісец і яго працы неаднойчы пераследаваліся. Кожная новая выстава майстра становіцца падзеяй у культурным жыцці краіны. Без шматбаковай дзейнасці грамадзяніна і мастака Алеся Мары немагчыма ўявіць беларускае нацыянальнае адраджэнне апошняй трэціны XX — пачатку XXI стагоддзяў. У розныя гады Марачкін — сябра аргкамітэту БНФ «Адраджэньне», першы старшыня суполкі «Пагоня» Беларускага саюза мастакоў, старшыня міжнароднага грамадскага аб'яднання «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» і адзін з заснавальнікаў грамадзянскай ініцыятывы Рада беларускай інтэлігенцыі. Пра свой лёс мастак распавёў журналісту «НЧ» Марату Гаравому.**



Аляксей Марачкін




«Прывіды (пераможцы)»

З 9 па 20 лістапада ў сталічным Палацы мастацтва экспануецца рэтраспектыўная выстава творчасці Алеся Мары «Логіка руберойду», на якой прадстаўлена каля 100 прац. Сярод іх — партрэты выбітных дзеячаў нацыянальнай гісторыі, у тым ліку палітыка Зянона Пазьняка, мастака-адраджэнца Яўгена Куліка і паэта Анатоля Сыса, тэматычныя кампазіцыі, краявіды, маляваныя дываны, прасніцы з біблейскімі і гістарычнымі сюжэтамі. Акрамя таго, мастак дэманструе шэраг сваіх нонканфармісцкіх твораў — у тым ліку дыптых «Логіка руберойду», які асацыюецца з ізаляцыяй чалавека і краіны, з жаданнем прымітыўна вырашаць складаныя праблемы, а таксама карціну «Сцяна». Гэтае палатно, у якім зафіксаваны шматлікія надпісы на мурах турэмных камер — своеасаблівая хроніка супраціву беларускай дэмакратычнай супольнасці апошніх 14 гадоў.

## Святло з дзяцінства

«Мне здаецца, што душа кожнага мастака фарміруецца з дзяцінства. Я нарадзіўся 30 сакавіка 1940 года ў вёсцы Новая Слабада (былая Папоўшчына) Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў шматдзетнай сям'і Антона і Хадоры Марачкіных. Менавіта яны фарміравалі маю душу. Маці — народнымі песнямі і паданнямі, бацька — вясковы бібліятэкар — сваім лёсам, думкамі і паводзінамі. Хаця тата не быў мастаком, але любіў мастацтва і прывёз з Другой сусветнай вайны шмат паштовак і альбомаў з каляровымі ілюстрацыямі твораў Дрэздэнскай карціннай галерэі. Я сядзеў на печы, лістаў гэтыя альбомы і быў зачараваны светам дзіўных твораў, якія праз гады пабачыў у арыгінале.

Тыповы вясковы інтэлігент і рамантык, душа якога ірвалася паглядзець свет, бацька маладым у пошуках працы і заробку аблётаў увесь Савецкі Саюз, працаваў у Эстоніі, Карэліі і Грузіі. На Далёкі Усход трапіў не па сваёй волі. Уцякаў ад рэпрэсій... У 1938 годзе, калі бушавала «яжоўшчына», тата працаваў памочнікам старшыні сельсавета, хаця і не быў камуністам. І вось аднойчы на «варанку» прыязджае да яго начальства з Чэрыкава з прапановай заняць пасаду арыштаванага старшыні сельсавета. Бацька зразумеў, што няма куды дзявацца і адмовіцца нельга, бо таксама арыштуюць. І гэтая думка ўзмацнілася пасля таго, калі, улучыўшы момант, адзін з прыбыўшых — знаёмы бацькі — сказаў яму на вуха: «Антон Мікалаевіч, калі хочаш застацца жывым, сёння ж ноччу збірайся, бяры клунак з сухарамі, пехам на Крычаў, сядай на любы цягнік і едзь як мага далей...» У тую ж ноч бацька з'ехаў на Далёкі Усход, а вярнуўся ў вёску толькі перад самай вайной.

## Мая незвычайная вёска

Жылі мы ў незвычайнай невялікай вёсцы, яка ўзнікла падчас НЭПу, калі ўлады раздавалі пляцы ўсім жадаючым і прапаноўвалі заводзіць гаспадарку на зямлі, якая раней належала праваслаўным святарам. Вось чаму на гэтую зямлю прыйшлі маладыя сем'і, якія атрымалі вялізарныя крэдыты ад дзяржавы і заснавалі новую вёску Папоўшчына, пазней перайменаваную ў Новую Слабаду. Нашая нетрадыцыйная вёска была своеасаблівай беларускай Амерыкай, бо ўсё яе насельнікі былі вельмі прадпрымальнымі, энергічнымі і багатымі гаспадарамі.

Сярод іх выдзяляўся ўнікальны майстар-вынаходнік Адам Смаленкін, які амаль зрабіў верталёт і пабудаваў аэрасані, на якіх катаў нас — малых. Бацька гэтага самаробка падчас вайны пад прымусам збіраў кажухі для немцаў, за што пазней сядзеў у турме, адкуль выйшаў маўклівым, ціхім і запалоханым. Застаўся ў памяці інтэлігентны Іван Драмок, які да Кастрычніцкага перавароту працаваў леснікам у маёнтку князёў Абаленскіх у Горках, дзе зберагаліся арыгіналы твораў Тыцыяна і Рэмбрандта. Гэты Драмок, сын якога, лётчык, загінуў на мінулай вайне, не пайшоў у калгас, хаця ў яго адабралі плуг і барану, не дазвалялі мець каня, і ён вымушаны быў каровай араць агарод. Я бачыў усе гэтыя несправядлівасці, а бацька мне выгаворваў: «Не вер камуністам і ў гэтую партыю не ўступай!», хаця з вайны сам прыйшоў камуністам. І калі школьнікам я стаў больш рэзка выказвацца, чым бацька, ён папярэджваў мяне: «Па табе сапраўды турма плача. Кола гісторыі не павернеш назад, але пад гэтае кола можаш патрапіць!»

## Мае настаўнікі

Тата быў чалавекам начытаным, цытаваў вершы Дзям'яна Беднага і ўрыўкі з рамана Мікалая Гогаля «Мёртвыя душы». З бібліятэкі бацька прыносіў шмат кніжак, у тым ліку творы Аляксандра Пушкіна, сатырычныя раманы Іллі Ільфа і Яўгена Пятрова «Золотой телёнок» і «Двенадцать стульев». Ужо да школы я добра чытаў і пісаў. Па навуку хадзіў пехам пяць кіламетраў у Язёрскую сярэднюю школу, дзе на маю свядомасць вельмі паўплываў настаўнік беларускай мовы і літаратуры Пётр Рыгоравіч Плісікаў. Хаця я шмат прачытаў расейскамоўных кніжак, руская мова давалася мне цяжка, бо я рос у атмасферы вясковай беларушчыны. А Плісікаў падтрымліваў маю цягу да роднай мовы і мастацтва, сусветнай літаратуры і вершаскладу, адкрыў мне ўсю прыгажосць паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». Не па загаду, не па праграме ён шмат урокаў вельмі выразна і ўзнёсла чытаў нам гэтую паэму, якую мы — вучні слухалі, адкрыўшы рот, а затым інсцэніравалі па ролях.

Больш за ўсё мне спадабалася складаць вершы і маляваць. У шостым класе я нават адправіў у дзіцячы часопіс «Бярозка» свой малюнак старой вярбы каля хаты і верш. Але на вокладцы часопіса быў апублікаваны толькі мой малюнак. І яшчэ невядома, як склаўся б мой творчы лёс, калі б гэты верш быў надрукаваны. Хлопчыкам я запісаўся ва ўсе бібліятэкі раёна і шукаў кнігі пра мастацтва. І калі ў Чэрыкаўскай раённай бібліятэцы я знайшоў брашуру «Илья Эренбург о Пабло Пикассо», мяне ўразілі рэпрадукцыі яго малюнкаў быка і пеўня. Мяне здзівіла і зачаравала графіка Пікаса, яго незвычайная манера малявання, якая спачатку здавалася даволі прымітыўнай.

У жыцці мне вельмі шанцавала на добрых людзей. Пасля сёмага класа я збіраўся паступаць у Мінскае мастацкае вучылішча і прыехаў у сталіцу да старэйшай сястры Анюты і дзядзькі Мішы, які працаваў шафёрам у Доме ўрады і вазіў начальства. Дык вось, дзядзька пазнаёміў мяне з мастаком Лявонам Баразной, які размаўляў на чысцюткай беларускай мове, добра ведаў нацыянальную гістарычную спадчыну, любіў народнае мастацтва, праводзіў фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі па краіне і зрабіў на мяне вялікі ўплыў. Дзякуючы яму я не паддаўся на агітацыю ехаць на цаліну, пераадолеў гэтую рамантычную спакусу, якая на некаторы час апанавала не толькі мяне, але і ўвесь наш клас. А на апошніх курсах навучання ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце я спрычыніўся да багатай спадчыны Язэпа Драздовіча.

## Маё апірышча

Мастацтва заўсёды дапамагала мне. І калі табе кепска — любімая праца з'яўляецца самай лепшай тэрапіяй. Праца не толькі забаўляе, як нейкая варажба, яна для цябе апірышча і не дазваляе зусім раскіснуць. Менавіта праца выратоўвала мяне падчас вучобы на факультэце графікі Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Тады мне было вельмі цяжка ад стрэсаў, звязаных з беграшоўем, беднатой і тым, што адзін з педагогаў у вельмі грубай форме выказаў сумненне наконт майго мастацкага таленту. Мая струна жыцця заўсёды напятая, не расслаблена-абвіслая, што парвання павуцінка на вятры. І каб гэтая струна не лопнула, я шукаю ў любімай працы нейкі паратунак ад нягод... Тым больш, што матэрыяльны свет грубы, у жыцці няма чыстай гармоніі, якую стварыў Бог. Але калі ты мастак, на сваіх палотнах ты сам творца і ў нейкай ступені адчуваеш сябе падобным Богу...

Напрыканцы 1980-х — на пачатку 1990-х гадоў мы глытнулі глыток свабоды. І адчулі, што можам быць такімі, якімі хочам. І разам гэта ўсё абрынулася і з цяжкасцю аднаўляецца. Я ўяўляю, што ўваскрос Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч і на сваё пытанне «Як вы тут, хлопцы?» пачуў адказ: «І Беларусь ёсць, і нават прэзідэнт у нас ёсць». «А ўжо які ён, гэта ад вас залежыць», — падкрэсліў пісьменнік. Вось чаму я павінен змагацца за тое, што выпакутаваў, і за сваю мару аб вольнай Беларусі.



«Сляза Міндоўга»

Для ранніх твораў мастака характэрны рэалістычная манера адлюстравання ў спалучэнні з аб'ёмнапластычным, рэльефным пісьмом і сімволіка-алегарычнымі матывамі. З 1990 года творы набываюць характар фармалістычных кампазіцый з камбінаванай манерай выканання і ўмоўнай перадачай аб'ёму. У адлюстраванні драматычных падзей гісторыі жывапіс Марачкіна дасягае выразнасці і публіцыстычнасці, некаторыя творы гучаць як адказ на вострыя актуальныя праблемы сучаснасці. Сярод іх — іконы «Маці Божая Курапацкая ўсіх бязвінна расстраляных» і «Маці Божая ахвяраў Чарнобыля».

**Мастацтвазнаўца Ларыса Салавей**

ЦІКАВА

# ЗАБОЙСТВА ВІЛЬГЕЛЬМА КУБЭ

## (ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ ЭСЭ)



Злева направа: Карл Цэнер — начальнік управы СС і паліцыі па Беларусі, Генрых Лоэз — рэйхскамісар Остланда, Вільгельм Кубэ

Працяг. Пачатак у №42 (265).

Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ

**Вільгельма Кубэ ў Трэцім рэйху паважалі як заўзятага і перакананага антысеміта, але ў красавіку 1936 года ён выслаў вярхоўнаму суддзі рэйхсканцлеру Вальтэру Буху ананімны ліст, у якім абвінаваціў яго ў праследаванні яўрэяў, адначасова згадваў семіцкае паходжанне яго жонкі.**

### Семіт ці антысеміт?

Пасля чарговага яўрэйскага пагрому 28 ліпеня 1942 года гаўляйтар прыехаў у гета, супакоіў яго жыхароў, казаў, што ўсё закончылася, што гэта справа рук не немцаў, а мясцовай паліцыі, ён раздаваў дзецям цукеркі і адкрыў дзіцячы дом (папярэдні дзіцячы дом разам з яго жыхарамі і медперсаналам раней павялі на расстрэл). Гэты эпізод вельмі ярка паказаны ў мастацкім фільме «Часы остановились в полночь», які быў зняты ў 1959 годзе на кінастудыі «Беларусьфільм». Гэта стужка прысвечана подзвігу А.Р. Мазанік, а паколькі фільм мастацкі, то многія падзеі ў ім паказаны не зусім такімі, якімі яны былі на самай справе.



Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі

Але антысемітызм Кубэ не перашкаджаў яму выратоўваць ад знішчэння «сваіх» жа нямецкіх яўрэяў, тых, каго дэпартавалі з Германіі і хто меў узнагароды Першай сусветнай вайны.

Жывучы ў Мінску, Кубэ хутка завязаў асабістыя сувязі і знаёмствы з некаторымі яўрэямі. Ён акружыў сябе яўрэйскімі піяністамі, цырульнікамі і іншымі. Адзін яўрэй Карл Лёвенштант быў вызвалены з Мінскага гета па асабістаму хадайніцтву Кубэ, генеральны камісар Беларусі лічыў яго сваім аднакурснікам і шмат гаварыў з ім пра той час. Гэта тым больш цікава, што Кубэ ў студэнцкія гады быў ярым антысемітам.

Як расказвае Гірш Смоляр у сваёй кнізе «Менскае гета», аднойчы ў гета прыйшла руская жанчына Марыя Гарохава (псеўданім «Маёрава», у лістападзе 1941 года — верасні 1942 года ўдзельніца Мінскага антыфашысцкага падполля, потым сувязная партызанскага атрада) на пяты дзень нямецкай разні з жоўтай латай на адзенні. Паводле загаду Мінскага гарадскога падпольнага цэнтра Гірш Смоляр павінен быў пакінуць Мінскае гета і перайсці непасрэдна пад «юрысдыкцыю» цэнтральнага мінскага кіраўніцтва. План пакінуць Мінскае гета распрацавалі хутка і вынікова. Гарохава і Смоляр зайшлі ў калону рабочых, якую збіраліся вось-вось весці на працу ў цэнтральную частку горада Мінска. Яны выйшлі з гета ў калоне рабочых-яўрэяў. У хуткім часе Гарохава падала сігнал рукой. І яны непрыкметна выслізнулі з калоны ў бакавы завулак. Ніхто іх не заўважыў. Не дайшоўшы да плошчы Свабоды, яны спыніліся, сарвалі з адзення жоўтыя латы і спакойна пайшлі да рэзідэнцыі генеральнага камісара Беларусі Кубэ. Гарохава падышла да нямецкага вартавога і на руска-нямецкай мяшанцы з дапамогай жэстаў патлумачыла немцу, што прывяла слесара рамантаваць у доме паравы кацёл.

Гірш Смоляр апынуўся ў яе кватэры, у цокальным паверсе таго самага будынку, дзе месцілася адміністрацыя Кубэ. Смоляр жыў на самых розных канспіратыўных кватэрах, але каб яўрэй з Мінскага гета быў суседам генеральнага камісара Беларусі, такога не змагла б уявіць нават самая незвычайная яўрэйская фантазія. І гэты факт бясспрэчны!

Акцыі знішчэння яўрэяў у Беларусі праводзіліся айнзацгрупамі і зондэркамандамі, паліцэйскімі часцямі СС, вермахтам і мясцовымі калабарантамі ўжо летам 1941 года. Штаты беларускай паліцыі ў 10 тысяч чалавек былі поўнасцю ўкамплектаваны. Іх дапаўнялі добраахвотнікі з Беларускай народнай самапомачы (БНС), Саюза беларускай моладзі (СБМ), Беларускай краёвай абароны і іншых беларускіх фармаванняў.

Карныя атрады ігнаравалі пазіцыю грамадзянскай нямецкай адміністрацыі аб прыпыненні расстрэлаў ахвяр Мінскага гета па прычыне «эканамічнай немэтазгоднасці». Гэбітскамісар горада Слуцка Карл і гаўляйтар Кубэ скардзіліся нават у Берлін на тое, што дзеянні па ліквідацыі яўрэяў наносілі эканамічны ўрон Трэцяму рэйху і праводзіліся «недастойнымі метадамі» і з садызмам.

Шмат людзей загінула зімой 1942 — восенню 1943 года. Асноўнай прычынай гэтых акцый лічылася сувязь з партызанамі, хаця на самай справе гэтыя акцыі былі раней прадуманы і запланаваны.

У сувязі з гэтым застаецца адкрытым пытанне аб мэтазгоднасці забойства Кубэ (паводле загаду І.В. Сталіна — забіць Кубэ), які крытыкаваў пазіцыю СС у яўрэйскім пытанні, што і паскорыла ліквідацыю Мінскага гета ў кастрычніку 1943 года.

### Пра дзяржаўнасць Беларусі

Яшчэ ў 1918 годзе Беларусь была для Берліна «невядомай краінай Еўропы». У міжваенны перыяд аўтарытэт Беларусі ў палітычных колах Берліна не ўзняўся — перашкаджала адсутнасць уласнай нацыянальнай дзяржаўнасці і аслабленне ў 1930-х гадах палітычных, эканамічных і культурных пазіцый беларускага нацыянальнага руху — з-за індустрыялізацыі, калектывізацыі, таталітарных сталінскіх рэпрэсій і г.д.

Цікавыя падобныя дзеянні Эрыха фон Фалькенгайна і Вільгельма Кубэ — кіраўнікоў акупацыйных адміністрацый Беларусі ў першай і другой акупацыях.

Эрых фон Фалькенгайн у 1914–1916 гадах быў начальнікам Генеральнага штаба германскай арміі. У 1918 годзе быў камандзірам 10-ай арміі, якая дыслацыравалася ў Беларусі. Эрых фон Фалькенгайн насуперак пазіцыі Берліна ў час Першай сусветнай вайны пасадзейнічаў стварэнню і непрацягламу існаванню БНР, якая заклала асновы беларускай дзяржаўнасці.

Вільгельм Кубэ ў час Другой сусветнай вайны ў значна горшых умовах паспрыяў адраджэнню падаўленых у 1930-я гады нацыянальных пачуццяў беларусаў і іх ідэалу дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.

Акалічнасці канфлікту «беларускага гаўляйтара» з СС і паліцыяй яскрава сведчаць, што яго паводзіны грунтаваліся не толькі на тактычных разліках — падзеі адбываліся ў той час, калі параза Германіі не здавалася яшчэ непазбежнай. Пасля смерці гаўляйтара Курт Готберг (пераемнік Кубэ) пераняў гэту палітычную лінію і надаў ёй эфектнае прапагандысцкае гучанне. Вынікі цывільнага праўлення — паступовая беларусізацыя адміністрацыі, арганізацыя беларускіх школ, СБМ, культурная і выдавецкая дзейнасць, беларусізацыя царкоўнага жыцця і, нарэшце, БНС, Камітэт даверу і Беларуская цэнтральная рада (БЦР), якія, хаця і не атрымалі фармальнага прызнання ў Берліне да канца акупацыі як органы нацыянальнага прадстаўніцтва, фактычна ўсё ж адыгрывалі гэтую ролю. Ідэю стварэння корпусу Самаахoвы, якую Кубэ не змог да канца ажыццявіць ва ўмовах усё нарастаючага канфлікту яго з СС і паліцыяй, пазней рэалізаваў Курт Готберг у выглядзе БКА. Ва ўмовах Беларусі гэтыя вынікі набывалі іншае значэнне, бо стваралі магчымасць для ўзмацнення і распаўсюджвання нацыянальнай свядомасці, для арганізацыі нацыянальнага грамадскага руху.

Курт Готберг не забыўся, як члены Камітэта даверу ў жніўні 1943 года выступалі з пратэстам супраць варварскіх метадаў карных атрадаў СС і паліцыі па расправах з мірным насельніцтвам Беларусі. Акупанты абяцалі даць дзяржаўную самастойнасць Беларусі ў складзе «Новай Еўропы».

27 чэрвеня 1943 года Кубэ загадаў стварыць пры камісарыяце Беларускую раду даверу — дарадчы орган з «прадстаўнікоў беларускай грамадскасці». Акупанты выдавалі сябе за сяброў беларускага народа, заклікалі беларусаў да супрацоўніцтва з імі, стваралі ўражанне ўдзелу «прадстаўнікоў народа» ў фашысцкіх органах кіравання і імкнуліся ўзняць аўтарытэт нацыяналістаў для таго, каб уцягнуць у арбіту іх уплыву частку беларускага насельніцтва. 21 снежня 1943 года ўжо Готберг абвясціў стварэнне Беларускай цэнтральнай рады. Яна была заклікана «мабілізаваць усе сілы беларускага народа на знішчэнне бальшавізму».

Калі ў Першую сусветную вайну для нямецкіх палітыкаў і гісторыкаў Беларусь была «невядомай краінай», то праз 20 гадоў генеральны камісар Беларусі гаўляйтар Вільгельм Кубэ ацэньваў яе як «імглісты геаграфічны панятак».

У 1941 годзе нямецкія цывільныя і ваенныя ўлады сустрэлі ў Беларусі парадаксальную пасіўнасць і нацыянальную абыякавасць мясцовага насельніцтва. Створаныя на пачатку акупацыі беларуская адміністрацыя і паліцыя мелі пераважна не беларускі характар і лёгка падпадалі пад уплыў ці савецкага ці польскага падполля. Але стаўка Кубэ на беларускі нацыяналізм рабіла сваю справу, і з вясны 1942 года становішча пачало мяняцца. Гэтаму спрыяла беларуская адміністрацыя, прэстыж беларускай мовы як дзяржаўнай, дзейнасць Беларускай народнай самапомачы, Самааховы, Саюзу беларускай моладзі, Рады даверу і Беларускай цэнтральнай рады. Як сведчаць архіўныя дакументы, прагрэс беларускага нацыяналізму непакоіў савецкае і польскае падполле, якое крывава распраўлялася з беларускімі грамадскімі дзеячамі.

Кубэ палічыў сваёй задачай развіццё беларускай культуры. Што тычыцца нацыянальных пытанняў, то ў іх Кубэ быў больш пазітыўны, чым савецкая ўлада. Ён не ўхваляў і злачынных метадаў барацьбы ваенных часцей СС з партызанскім рухам.

31 лістапада 1941 года ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі стаў галоўным школьным інспектарам Беларусі. У ліпені 1942 года шэф БНС Ермачэнка звярнуўся да Кубэ з прапановай аформіць кананічнае прызначэнне Гадлеўскага генеральным вікарыем Каталіцкай Царквы ў Беларусі, дзе даў яму такую характарыстыку: «…Ксёндз Гадлеўскі ёсць нам вядомы як свядомы беларус, прыхільнік нямецка-беларускага супрацоўніцтва і добры барацьбіт проці палякаў». 23 снежня 1942 года выйшла «Беларуская газета» з артыкулам Гадлеўскага «25-я ўгодкі склікання Усебеларускага Кангрэсу». У гэтым артыкуле быў увярстаны верш Ларысы Геніюш, дзе давалася водпаведзь і расійцам, і немцам і які заклікаў народ на абарону за свабоду і незалежнасць Беларусі. Раніцай 24 снежня 1942 года Гадлеўскі быў арыштаваны нямецкай паліцыяй, адпраўлены ў мінскую турму і, паводле звестак, на каталіцкае свята — Ражаство Хрыстова — расстраляны ў Трасцянцы.

Некалькі гадоў таму яго пахаванне прыблізна было знойдзена, і цяпер на гэтым месцы кожны год 24 снежня ўскладаюцца кветкі, зусім нядаўна тут усталяваны каталіцкі паклонны крыж.

У той час, калі адно нямецкае ведамства лічыла Гадлеўскага «чыстым» (інакш яго артыкул не быў бы дапушчаны да друку!), другое — ворагам.

Гэты парадокс адлюстроўваў востры канфлікт, які ўзнік у канцы 1942 года паміж галоўнымі дзеячамі акупацыйнага рэжыму ў Беларусі на фоне супрацьпартызанскіх метадаў барацьбы. Кубэ абвінавачваў кіраўніцтва СС і паліцыі ў масавых забойствах мірнага насельніцтва Беларусі, за што яны імкнуліся выдаліць гаўляйтара з Мінску. З гэтай мэтай пачалася кампанія кампрамату на Кубэ як ініцыятара і натхняльніка палітыкі кіраўніцтва БНС, нібыта супярэчлівай з інтарэсамі Германіі, якое імкнулася стварыць беларускае войска і органы беларускага кіравання. У атмасферы такіх паліцэйскіх ганенняў супраць Ермачэнкі і яго паплечнікаў тады было арыштавана каля 100 дзеячаў БНС у Мінску і на тэрыторыі Беларусі. Сярод іх — і ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, які быў знішчаны як нежаданы саюзнік Вільгельма Кубэ.

Працяг у наступным нумары

▸ ЭНТУЗІЯСТЫ

# ЧАТЫРЫ ТЫСЯЧЫ СЛОЎ АД НАСТАЎНІКА

Сяргей ЧЫГРЫН

**Такі слоўнік зрабіў бы гонар спецыялізаванаму інстытуту. Алесь Зайка справіўся з гэтай задачай адзін.**




З настаўнікам Алесем Фамічом Зайкам з вёскі Заполле Івацэвіцкага раёна мы сустрэліся ў Слоніме, каля мясцовай друкарні, адкуль ён з радасцю насіў у машыну пачкі са сваёй новай кнігай. «Я звычайна прыязджаю ў Слонім і вандрую па сваім Івацэвіцкім раёне на матацыкле, але сёння папрасіў сваяка, і мы прыехалі па кнігі ў друкарню на машыне», — прызнаўся Алесь Фаміч.

Калі ўсе пачкі былі пагружаны ў машыну і вырашаны пытанні з друкарняй, Алесь Фаміч дастаў адну кнігу і паставіў мне на ёй свой першы аўтограф. «Гэта плён маёй 35-гадовай працы. І цяпер, Сяргей, у мяне столькі гонару за родную мову, што ты не паверыш. І мне так шкада тых, хто не ведае яе…» — радасна сказаў Алесь Фаміч і падараваў мне сваю новую кнігу «Дыялектны слоўнік Касаўшчыны».

Калі я хуценька прабег старонкі вачыма — быў у шоку ад таго, што сабраў і зрабіў гэты вясковы энтузіяст. Такія слоўнікі павінны збіраць і выдаваць цэлыя інстытуты, а ён справіўся адзін і выдаў асобнай кніжкай на 270 старонак, што налічваюць каля 4000 слоў, запісаных краязнаўцам. І гэта толькі пра дыялекты Касаўшчыны. А ў планах асобнымі кнігамі Алесь Фаміч плануе выдаць «Мікратапанімію Івацэвіччыны», «Паселішчы Івацэвіччыны», «Фразеалагічны слоўнік Касаўшчыны», «Прымаўкі і прыказкі Касаўшчыны» і іншыя. Вось каму трэба даваць дзяржаўныя прэміі, ордэны і медалі…


Фота аўтара

Алесь Зайка

Алесь Зайка нарадзіўся і жыве ў вёсцы Заполле Івацэвіцкага раёна. У 1966 годзе скончыў Касаўскую сярэднюю школу і паступіў на філалагічны факультэт Брэсцкага пэдінстытута. Потым вярнуўся ў родную вёску, дзе працаваў настаўнікам спачатку фізкультуры, пасля беларускай мовы і літаратуры. Цяпер у роднай школе кіруе этнаграфічным музеем.

Многія этнаграфічныя работы Алеся Зайкі ўвайшлі ў выдадзеныя кнігі аб Івацэвіцкім раёне, артыкулы па даўнім і нядаўнім гістарычным мінулым раёна пастаянна друкуюцца ў прэсе, з цікавасцю сустракаюцца чытачамі. Сёлета ў Мінску ён выдаў і кнігу прозы «Дым у коміне», куды ўвайшлі лірычныя запісы, мініяцюры і апавяданні. Мастацкая проза Алеся Зайкі прасякнутая шчырай любоўю да роднай зямлі, да сваіх землякоў, напоўнена непадробным захапленнем, духоўным багаццем беларускага народа, прыгажосцю свайго краю.

Але найбольшым захапленнем Алеся Зайкі быў і застаецца збор этнаграфічных і краязнаўчых матэрыялаў. «Любіць мову — значыць ведаць яе, аберагаць, не даваць памерці, не згубіць ніводнага слова», — разважае Алесь Фаміч. І ён іх збірае, запісвае, вывучае. Гэта ён некалі адстаяў у краязнаўчых колах сапраўдную назву ўрочышча, дзе нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, — Марачоўшчына. Бо ўсе выданні пісалі на польскі манер — Мерачоўшчына. А касаўскі краязнавец даказаў, што слова «марачоўшчына» паходзіць ад слова «марочна» — гэта значыць балоцістая мясцовасць.

Чытаючы «Дыялектны слоўнік Касаўшчыны» Алеся Зайкі, можна знайсці сотні вельмі цікавых, арыгінальных, калі так можна сказаць, «смачных» беларускіх слоў. Ну чаго каштуе, напрыклад, слова «сухарэбрык». Ці такія словы, як «сусло», «палявік», «клёк», «дзяцеліна», «бэзло», «чарняк», «падбіванка», «навільнік», «крыкля», «званярня» і г.д.

У кнізе знайшла сваё адлюстраванне самая разнастайная па значэнню лексіка: назвы страў, адзення, абутку, назвы прадметаў ужытку, тэрміны рыбалоўства, ткацтва, будаўніцтва, лясной гаспадаркі, батанічная заалагічная лексіка, лексіка медыцыны, ветэрынарыі і іншая. Усе яны маюць адпаведныя паметы ў слоўнікавых артыкулах. Таксама шырока прадстаўлены назвы дзеянняў, стану, якасці, уласцівасцей і прымет прадметаў.

Пасля кожнага прыкладу ўказваецца населены пункт, у якім запісана слова, яго адміністрацыйная прыналежнасць. А ў канцы слоўніка аўтар прыводзіць звязныя тэксты, якія яскрава ілюструюць дыялектныя асаблівасці жывой гаворкі Касаўшчыны.

Захапленне Алеся Зайкі заўсёды падтрымліваў ягоны сябра, зямляк і аднакурснік паэт Алесь Разанаў. Гэта дзякуючы яго маральнай і матэрыяльнай падтрымцы ўбачыў свет «Дыялектны слоўнік Касаўшчыны».

Калі мы развітваліся каля слонімскай друкарні, Алесь Фаміч сказаў, што, як хопіць у яго сіл, то будзе працаваць над наступнымі кнігамі. «Трэба дбайна збіраць скарбы сваёй зямлі, апрацоўваць іх, выдаваць, і тады ў нас усё будзе як у еўрапейскіх людзей», — усміхнуўся Алесь Фаміч, сеў у машыну і паехаў у сваё Заполле.

▸ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# «РАСКРЫЛІ КРЫЛЫ МУЗЫ»

Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ

**У Палацы мастацтваў адбылася прэзентацыя каталога калекцыі прыватнага мастацкага музея Анатоля Белага ў Старых Дарогах. Каталог выдадзены ў канцы кастрычніка гэтага года ў Мінску ў выдавецтве «Рыфтур» накладам 300 асобнікаў.**

Кніга складаецца з двух раздзелаў — «Медальернае мастацтва» і «Выяўленчае мастацтва» (жывапіс, графіка, скульптура). У канцы кнігі змешчаны водгукі пра Старадарожскі музей выяўленчага мастацтва Анатоля Белага народнага мастака Беларусі, заслужанага дзеяча мастацтва БССР Леаніда Шчамялёва, мастацтвазнаўца, сябра клуба «Спадчына» Анатоля Мяльгуя, беларускага паэта, перакладчыка Віктара Шніпа. У «Дадатку» да каталога прозвішчы мастакоў, графікаў, скульптараў.

Гэты каталог — першая спроба навукова асэнсаваць і паказаць грамадскасці тую вялікую справу, якую зрабіў Анатоль Белы для беларускай культуры і мастацтва. На старонках каталога змешчаны лепшыя творы вядомых мастакоў і працы іх маладых паплечнікаў. Іх аб'ядноўвае адданасць беларускай справе, пошук і адраджэнне рэальнай непадфарбаванай гісторыі беларускага краю.

Мастак і старшыня Саюза беларускіх мастакоў Рыгор Сітніца адзначыў маштаб зробленага Анатолем Белым, які не маючы адпаведнай мастацкай адукацыі змог стварыць цікавы мастацкі музей, сабраць у ім вялікую калекцыю мастацкіх твораў. Для музея пабудаваў асобны двухпавярховы мураваны будынак.

Мастак Уладзімір Мелехаў звярнуў увагу на тое, што будучы на пасадзе старшыні клуба «Спадчына» на працягу 27 гадоў, Белы здолеўператварыць яго ў сапраўднае навуковае таварыства, дзе з лекцыямі, дакладамі, паведамленнямі выступалі вядомыя беларускія вучоныя, пісьменнікі, гісторыкі, публіцысты, мастакі, артысты, праводзіліся ўсебеларускія дыктоўкі і іншыя культурна-асветніцкія мерапрыемствы. Музей у Старых Дарогах наведвалі амбасадары ЗША, Чэхіі, Швецыі.

Журналістка, выдавец, грамадская дзяячка і укладальніца каталога Святлана Белая распавяла пра свайго тату як краязнаўца, калекцыянера, вучонага, ствагральніка музея. «Ён шчыра і самаахвярна рабіў і робіць шмат па захаванню спадчыны Беларусі», — сказала яна ў заключэнне.


Анатоль Белы

Каталог «Раскрылі крылы музы» паклаў пачатак выданню серыі кніг, прысвечаных гісторыі мастацтва Беларусі з глыбокай старажытнасці і да нашых дзён.

*Аб 11 гадзіне вечара 14 лістапада ад цяжкой анкалагічнай хваробы памёр Анатоль Белы — вядомы беларускі гісторык, заснавальнік музея ў Старых Дарогах. Дзякуй Богу, ён яшчэ паспеў пабачыць кнігу, у якой расказана аб галоўнай справе яго жыцця — Старадарожскім музеі выяўленчага мастацтва. Мы смуткуем аб сыходзе Анатоля Белага – выбітнага дзеяча беларускага адраджэння найноўшага часу. Але на ўсцяшэнне нам і нашчадкам яго музей — скарбніца беларушчыны.*

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1173

Падпісана да друку 11.11.2011. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.